Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

19 ЛІСТАПАДА 2021 г.
ПЯТНІЦА
№ 224 (29593)

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

+TV ПРАГРАМА

ДЭФІЦЫТ БЮДЖЭТУ — МІНІМАЛЬНЫ 5

ВАНДРОЎКА Ў КАСЦЮКОВІЧЫ 19

МЕХАНІЗМ У ДЗЕЯННІ

Беларусь выконвае свае абяцанні ў рамках рэалізацыі механізму, які Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка прапанаваў падчас тэлефоннай размовы з канцлерам Германіі Ангелай Меркель. Аб гэтым БелТА заявіла прэс-сакратар Прэзідэнта Беларусі Наталля Эйсмант у адказ на просьбу праінфармаваць аб абстаноўцы на гэты момант і дзеяннях беларускага боку ў кірунку ўрэгулявання крызісу з бежанцамі.

«Так, у развіццё размоў Прэзідэнта Беларусі з канцлерам Германіі а праінфармую аб становішчы на гэты момант. На сёння на тэрыторыі Беларусі знаходзіцца каля сямі тысяч бежанцаў. З іх на граніцы — у так званым стыхійным лагеры — каля дзвюх тысяч чалавек. І ад 200 да 500 чалавек — паводле інфармацыі — таксама знаходзяцца на граніцы, але стыхійна, у іншых пунктах. Гэта бежанцы, якіх палякі спрабавалі выкінуць сілай за межы Польшчы пасля таго, як людзі туды ўжо трапілі», — адзначыла Наталля Эйсмант.

Яна расказала, што падчас першай размовы з канцлерам Германіі Ангелай Меркель механізм, які прапанаваў Прэзідэнт Беларусі, быў наступны: «Еўрапейскі саюз стварае гуманітарны калідор для дзвюх тысяч бежанцаў, якія знаходзяцца ў лагеры. Мы бяром на сябе абавязацельства садзейнічаць (наколькі гэта магчыма і пры іх жаданні) астатнім пяці тысячам вярнуцца на Радзіму. І Ангела Меркель, паводле дамоўленасцяў, будзе весці перагаворы з ЕС, у тым ліку па арганізацыі гуманітарнага калідора ў Германію».

«Як бачыце, нават ужо на сёння мы свае абавязацельствы выконваем! Так, на жаль, толькі каля 400 бежанцаў пагадзіліся вярнуцца на радзіму. Усяго, калі быць дакладнымі, у самалёце, які паляцеў сёння, — 374 пасажыры, пераважна грамадзяне Ірака», — адзначыла прэс-сакратар.

Паводле яе слоў, астатнія, тыя, хто знаходзіцца ў Беларусі, працягваюць настойваць на забеспячэнні гуманітарнага калідора ў Заходнюю Еўропу, і найперш у Германію. «Гэта значыць, пакуль яны катэгарычна адмаўляюцца паляцець, але мы будзем над гэтым працаваць. І, тым не менш, ужо можна гаварыць аб тым, што работа міграцыйных службаў Беларусі сумесна з Міністэрствам замежных спраў дала вынік. Мы выконваем свае абяцанні. Прытым што з боку Еўрасаюза пакуль не выканана ніводнага абавязацельства», — звярнула ўвагу Наталля Эйсмант.

Больш за тое, Еўрасаюз пакуль нават не пачаў перагаворы на ўзроўні экспертаў, аб чым дамовіліся Прэзідэнт Беларусі і канцлер Германіі падчас другой размовы.

«І яшчэ. У сувязі з тым, што ў апошнія двое сутак — ужыўшы супраць мірных бежанцаў слёзатачывы газ, святлошумавыя гранаты, выкарыстоўваючы ядахімікаты, гербіцыды, пестыцыды і гэтак далей — польскі ўрад аб'явіў гэта нейкай «перамогай», прычым не толькі над Беларуссю, але і над Расіяй (менавіта так падаюцца імі ў СМІ падзеі на беларуска-польскай граніцы — мы ж разумеем: для таго каб адцягваць увагу ўласнай грамадскасці, польскага народа), Прэзідэнт у сувязі з гэтым на нарадзе з міграцыйнымі службамі і іншымі органамі ўлады даручыў максімальна садзейнічаць вяртанню бежанцаў на радзіму і выкананню іх іншых пажаданняў. Умова адна — іх жаданне. Сілай выштурхоўваць у Ірак, Сірыю або іншыя краіны мы нікога не будзем», — падкрэсліла Наталля Эйсмант.

Фота БелТА.

ЯНЫ ПАЛЯЦЕЛІ. НЕ ВЯРТАЦЦА НЕ АБЯЦАЛІ

Учора пад вечар у стыхійным лагеры бежанцаў нікога не засталося. Людзі, якія адмаўляліся ісці ў цёплае і сухое памяшканне лагістычнага цэнтра, спадзяваліся, што граніцу ўсё ж адкрыюць. Але надыходзіла яшчэ адна халодная ноч, і ўжо нават у самых стойкіх не засталося сіл начаваць у шалашах на задубелай зямлі. Начаваць яны прыйшлі ў лагістычны цэнтр. Сёння прачнуцца і будуць зноў чакаць, што іх прапусцяць. Надзея не знікае нават у безнадзейнай сітуацыі. Там, адкуль гэтыя людзі выправіліся ў сваё небяспечнае далёкае падарожжа, «безнадзейная сітуацыя» — гэта літаральны, а не вобразны выраз.

Некаторыя — усяго 374 чалавекі — учора пагадзіліся вярнуцца на радзіму і селі на рэйс з Мінска да Эрбіля і Багдада. Гэта першы вынік дамоўленасцяў, якія пачаў выконваць беларускі бок. Але наша пазіцыя катэгарычная: нікога з бежанцаў не выштурхоўваць з краіны сілай. Бо куды ім вяртацца? У якія ўмовы? І хто гэтыя ўмовы — дакладней іх адсутнасць — на іх радзіме для іх стварыў?

Шукаючы, па сутнасці, відавочны адказ на гэта пытанне, задаешся яшчэ адным. Гэтыя 374 чалавекі, як і тыя, што, магчыма, пагодзяцца вярнуцца дамоў сёння або заўтра, сапраўды пакінуць надзею трапіць у Еўропу? Багатую і сытую Еўропу, якая прымала дзейсны ўдзел у разбурэнні іх краін, іх жыцця, а цяпер адну руку нібы цягне насустрач, а другой наводмаш б'е. Не, яны ўсё роўна будуць спрабаваць туды трапіць. Не праз Беларусь, дык праз Турцыю, праз Афрыку. Дзеля сябе, дзеля будучыні дзяцей. Вярнуць некалькі тысяч чалавек туды, адкуль яны прыехалі, — насамрэч не праблема. Праблема — зрабіць так, каб яны там захацелі застацца, каб яны маглі там бязбедна і бяспечна жыць.

Толькі тыя, хто рушыў іх свет, наўрад ці пра гэта будуць рупіцца. І бежанцы яшчэ доўга будуць стукаць у дзверы Старога свету з усіх бакоў. І, магчыма, ператвораць яго ў Новы. І, якія б ні былі наступствы, гэта будзе справядліва.

КАРАТКА

- **Раман Галоўчанка і Міхаіл Мішусцін абмеркавалі рэалізацыю саюзных праграм.**
- У Беларусі абноўлены правілы карыстання газам у побыце.
- **Папярэднія вынікі беларуска-амерыканскага праекта па вывучэнні эфектыўнасці ДНК-вакцыны «Аленаген» прапануюць у снежні.**
- Гістарычная драма «Каралеўская гульня» адкрые кінафестываль «Лістапад» у Мінску.

ЦЫТАТА ДНЯ

Аляксандр АЎРАМЕНКА, намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення будаўніцтва і жыллёвай палітыкі — начальнік упраўлення жыллёвай палітыкі Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва:

«Развіццё індывідуальнага жыллёвага будаўніцтва ў краіне застаецца адным з асноўных напрамкаў будаўніцтва жылля ў цэлым. Трэба адзначыць, што Дырэктывай № 8 даручана забяспечыць будаўніцтва індывідуальнага жылля ў памеры не менш як 40 працэнтаў ад агульнага аб'ёму жылля, што ўводзіцца. У сувязі з гэтым штогод для мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў устанаўліваецца заданне па будаўніцтве індывідуальных жылых дамоў у названым аб'ёме, гэта значыць, калі агульны аб'ём будаўніцтва жылля знаходзіцца ў нас на ўзроўні 4 млн кв. м у год, то атрымліваецца, што не менш за 40 % — гэта 1,6 млн кв. м. Па факце так і выходзіць. Летась было ўведзена ў эксплуатацыю 10 023 індывідуальныя жылыя дамы, агульная плошча якіх складае больш за 1,7 млн кв. м — гэта складае 42 % ад агульнай плошчы жылых дамоў, уведзеных у эксплуатацыю».

ISSN 1990 — 763X

Наша пазіцыя

З міжнароднымі арганізацыямі ў Жэневе працуем па максімуме

Пра гэта заявіў Пастаянны прадстаўнік Беларусі пры Аддзяленні ААН і іншых міжнародных арганізацыях Юрый АМБРАЗЕВІЧ. Учора Міністэрства замежных спраў арганізавала з ім відэапрэс-канферэнцыю, падчас якой пасол расказаў аб шэрагу яго перагавораў па мігранцкім крызісе ў Беларусі.

«З боку кіраўніцтва сакратарыятаў міжнародных арганізацый у бок Беларусі не маецца ніякіх прэтэнзій і не маецца абвінавачванняў, што наша краіна парушае нейкія нормы міжнароднага права, у тым ліку і наша нацыянальнае заканадаўства», — сказаў Юрый Амбразевіч.

Пазіцыю чыноўнікаў Бруселя, якія, з аднаго боку, заклікаюць выконваць міжнародныя абавязкі ў сферы работы з бежанцамі, а з іншага — дэманструюць сваё адзінства з відавочнымі парушэннямі ў дзеяннях Польшчы, Літвы, Латвіі, ён назваў двудушнай.

Беларусь у апошнія дні эскалацыі на граніцы, паводле Юрыя Амбразевіча, знаходзіцца ў рэгулярным кантакце з сакратарыятамі міжнародных арганізацый у Жэневе. «Мы пастаянна на экспертным узроўні працуем з сакратарыятамі, даём неабходную інфармацыю. У апошнія дні пашыраны дыялог на высокім узроўні», — сказаў Пастаянны прадстаўнік Беларусі пры Аддзяленні ААН.

Ён паведаміў, што за апошні дзень правёў сустрэчу з Вярхоўным камісарам ААН па справах бежанцаў, Вярхоўным камісарам ААН па правах чалавека, кіраўніком сакратарыята Міжнароднай федэрацыі грамадстваў Чырвонага Крыжа, кіраўніцтвам аддзялення ЮНІСЕФ у Жэневе. Запланаваны таксама перагаворы з гендырэктарам Міжнароднай арганізацыі па міграцыі і прэзідэнтам Міжнароднага камітэта Чырвонага Крыжа.

«Падобныя сустрэчы дазваляюць нам даносіць беларускую пазіцыю да кіраўніцтва сакратарыятаў міжнародных арганізацый. Мы выкарысталі апошнія мае сустрэчы з кіраўнікамі для перадачы палітычнага паслання міністра замежных спраў Уладзіміра Макея ў адрас гэтых арганізацый і іх кіраўнікоў, каб не толькі задзейнічаць практычны мандат міжнародных арганізацый у гуманітарнай сферы, але і для таго, каб аўтарытэт гэтых кіраўнікоў дазволіў выйсці на аднаўленне і пашырэнне кантактаў з нашымі суседзямі і членамі Еўрапейскага саюза», — дадае спікер.

Па яго словах, зараз рэсурс работы Беларусі пры міжнародных арганізацыях у Жэневе задзейнічаны па максімуме. «Беларусь спадзяецца, што адпаведныя аддзяленні дакладна зафіксуюць парушэнні праў чалавека, што дапускаюць нашы партнёры, супрацьдзейнічаючы бежанцам і мігрантам у іх легальных спробах атрымання статусу бежанцаў на тэрыторыі сумежных з Беларуссю краін», — падкрэсліў пасол.

Юрый Амбразевіч выказаў спадзяванне, што кантакты на высокім узроўні, пасрэдніцтва ААН дапамогуць выйсці на стратэгічнае доўгатэрміновае вырашэнне праблемы бежанцаў.

Галоўны палітычны інтарэс Беларусі ў пытанні праблемы міграцыі апошнія гады заключаўся ў прыцягненні ўвагі міжнароднай супольнасці да прычын перамяшчэння асоб, адзначае Юрый Амбразевіч. Асабліва актуальна праблема міграцыі і бежанства ў ААН устала ў 2015 годзе, калі абвастрыўся канфлікт ў Сірыі. Тады ж, нагадаў пасол, узнік мігрантаў крызіс у ЕС. Толькі Германія з 2015 года прыняла больш чым мільён бежанцаў. Тэматыка работы з бежанцамі ўнесла раскол у Еўрасаюз — некаторыя краіны адмовіліся іх прымаць, падзяляючы нагрузку.

Марыя ДАДАЛКА.

Кантэкст

МОМАНТ ІСЦІНЫ

Сітуацыя на беларуска-польскай граніцы стала своеасаблівай лакмусавай паперкай, якая праявіла шэраг важных адметнасцяў. Напрыклад, высветлілася, што несур'ёзныя дзяржавы займаюцца несур'ёзнымі справамі, а з тым хаосам, які яны стварылі, імкнуцца разабрацца сур'ёзныя геапалітычныя гульцы. Няма нічога дзіўнага ў тым, што калі на польска-беларускай (а значыць, еўрапейска-беларускай) граніцы склалася патавая сітуацыя, яны падключыліся да справы. Аб гэтым у сваім аналітычным артыкуле для выдання Mysl Polska піша гісторык, прэзідэнт польскага Нацыянальнага фонду імя Рамана Дмоўскага Пшамыслаў Пяста, паведаміў інтэрнэт-партал «ИноСМИ».

ВАРШАВА СУПРАЦЬ

Прэзідэнт Францыі Эмануэль Макрон абмеркаваў тэму па тэлефоне з расійскім лідарам Уладзімірам Пуціным, а канцлер Германіі Ангела Меркель, якая пакідае сваю пасаду, але ўсё яшчэ карыстаецца павагай, паразмаўляла з Прэзідэнтам Беларусі Аляксандрам Лукашэнкам. «Зацікаўленыя бакі пачалі ювелірную дыпламатычную гульню. Дзякуючы гэтаму яны, напэўна, даб'юцца часткі сваіх палітычных мэт», — піша Пшамыслаў Пяста.

Чым займалася тым часам Польшча? Прэзідэнт гэтай краіны ўжо паспяшаўся заявіць, што Варшава не падтрымае прапанаваныя Берлінам і Мінскам шляхі выхаду з міграцыйнага крызісу. Замест пошуку выйсця з сітуацыі яшчэ больш узмацняецца надзвычайны рэжым на граніцы. Сейм прыняў чарговую папраўку да закона аб абароне дзяржаўнай граніцы, паведаміла польскае радыё RMF24. Папраўка прызначана забяспечыць «эфектыўнасць дзеянняў, прыманых пагранічнай службай для абароны граніцы ў выпадку пагрозы дзяржаўнай бяспецы або грамадскаму парадку». Пры гэтым сейм фактычна падзяліўся: за змяненні прагаласавалі 245 дэпутатаў, 167 выказаліся супраць, 25 устрымаліся.

Папраўка прадугледжвае часовую забарону на знаходжанне ў прыгранічнай зоне на падставе пастановы міністра ўнутраных спраў і адміністрацыі. У гэтай пастанове будуць пазначаны вобласць і працягласць забароны. Пастанова не будзе распаўсюджвацца на жыхароў забароненай зоны; людзей, якія працуюць там на аплатнай рабоце, а таксама на студэнтаў або грамадзян, якія карыстаюцца пагранічнымі пераходамі. Згоду на прысутнасць у забароненай зоне іншых людзей, у прыватнасці журналістаў, можа даць начальнік мясцовай пагранічнай службы.

Новыя правілы таксама пашыраюць пералік прымусовых мер, якія ваенныя могуць прымяніць у адносінах да парушальнікаў. У прыватнасці, супрацоўнікі пагранічнай службы могуць выкарыстоўваць рацавыя балоны са спецсродкамі. Як вядома, Польшча ў сувязі з міграцыйным крызісам у пачатку верасня ўвяла надзвычайнае становішча ў прыгранічных рэгіёнах. У забароненую зону не пускаюць прадстаўнікоў СМІ, а таксама валанцёраў і прадстаўнікоў гуманітарных арганізацый, якія маглі б аказаць дапамогу бежанцам.

Польшча ўсё ж не сядзіць склаўшы рукі, іранізуе Mysl Polska. Нацыянальны банк, напрыклад, збіраецца выпусціць калекцыйную банкноту ў гонар перамогі польскіх пагранічнікаў над групай асабліва непрыемных імігрантаў. Гэта вікторыя, відаць, пераўзыходзіць па сваім бляску трыумф у Хоцінскай бітве 1671 года, гадавіну якой палякі нядаўна адзначалі, паколькі тая спецыяльнай банкноты не была ўдастоена, заўважыў на старонках Mysl Polska Пшамыслаў Пяста.

У сваю чаргу генеральны сакратар італьянскай арганізацыі «Няма міру без справядлівасці» (NPWJ) Нікола Фіга-Таламанка заявіў, што дзеянні Польшчы ў сітуацыі з бежанцамі на граніцы супярэчаць міжнароднаму праву, паведаміла Euronews. Паводле яго слоў, Варшава парушае палажэнні Канвенцыі аб бежанцах. Ён адзначыў, што людзі маюць права шукаць прыстанішча ў іншай краіне. Гэта прадугледжана артыкулам 3.1 Канвенцыі аб бежанцах. І тое, пры якіх умовах бежанцы трапілі на тэрыторыю іншай краіны, не пазбаўляе іх права на прыстанішча. «Часта асобы, якія шукаюць прыстанішча, вымушаны прыбываць або пранікаць на тэрыторыю без дазволу, таму што яны бягуць з-за праследаванняў», — адзначыў Нікола Фіга-Таламанка.

ПРАЗ ЧЫРВОНУЮ РЫСУ

Тое, што ўчыняецца Польшчай на граніцы, выклікае пачуццё грэблівасці і агіды. «Увесь свет у дзеяннях польскіх сілавікоў у рэальным часе ўбачыў садызм, дзяржаўны тэрарызм, гестапаўскія метады і ўпэўненасць у сваёй беспакаранасці. Польскае кіраўніцтва перайшло чырвоную рысу, і дарогі назад для іх ужо няма. Прымяненне крывавым рэжымам Дуды супраць няўзброеных бежанцаў спецсродкаў, у тым ліку святлошумавых гранат, газу і хімікатаў, на беларускай тэрыторыі трэба расцэньваць як адкрытую агрэсію ў адносінах да Беларусі», — заўважыў БелТА загадчык аддзела сацыялогіі дзяржаўнага ўпраўлення Інстытута сацыялогіі НАН кандыдат філасофскіх навук Мікалай Шчокін.

Паводле яго слоў, польскае кіраўніцтва канчаткова паставіла сябе па-за законам і стала ваеннымі злачынцамі. «Варшава ўсімі сродкамі і метадамі спрабуе тарпедаваць і сарваць пагадненні (нават прамежкавыя дамоўленасці Мінска і Еўропы), тым самым падкрэсліваючы поўнае ігнараванне міжнароднага права», — адзначыў эксперт. Аналізуючы абстаноўку на граніцы, перагаворы па вырашэнні крызісу, ён робіць выснову, што прынцыповае рашэнне па бежанцах ужо, магчыма, прынята. «Хочацца верыць, што ў найбліжэйшы час ім будзе дадзена магчымасць пакінуць тэрыторыю Беларусі. У той жа час праблема больш глыбокая, трагічная і небяспечная. Неабходна вырашаць пытанне ў прынцыпе і стратэгічна. Міграцыйны крызіс толькі пачынае набіраць абароты. Разважлівая частка Захаду павінна разабрацца з прычынамі і знайсці прымальнае рашэнне па дээскалацыі напружанасці ў тых краінах, якія былі ім разбураны і абрабаваны, і выпрацаваць для сябе комплекс мер па недапушчэнні такіх крызісаў», — лічыць Мікалай Шчокін.

Трэба мірна ўрэгуляваць пытанне з бежанцамі на граніцы, заявіў БелТА член Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры і навуцы Палаты прадстаўнікоў Сяргей Клішэвіч. «Еўропа вельмі доўга не заўважала гэту праблему. Мігранты ж з'явіліся ў Беларусі не ўчора. Але разам з тым, як мы з вамі ведаем, гэтае пытанне адцягвалася. Сёння Еўропа разумее, што трэба размаўляць», — адзначыў Сяргей Клішэвіч.

Жорсткае стаўленне Польшчы да бежанцаў нікога не можа пакінуць абыякавым. Праўда, як удакладніў Сяргей Клішэвіч, у гэтых дзеяннях няма нічога незвычайнага. «Гісторыя паказвае, што палякі па сутнасці заўсёды былі «гienамі Еўропы». Так іх называлі. Гэта гістарычны тэрмін. Сёння гэта яны пацвярджаюць сваёй палітыкай, — дадаў ён. — Што датычыцца Беларусі, то зноў гістарычна так склалася, што мы заўсёды гатовы прыйсці на дапамогу. І так сёння чарговы раз адбываецца. Прычым гэта робіцца простымі людзьмі. Мы бачым, як грамадскасць паднялася на дапамогу гэтым бедным людзям. Немагчыма глядзець кадры з месца падзей і заставацца абыякавымі. У нас гэта ў крыві. Мы не можам проста так прапусціць міма сябе такое стаўленне да бежанцаў і ўмовы, у якіх гэтыя людзі цяпер знаходзяцца. Гэта яшчэ раз сведчыць аб нашым здаровым грамадстве, якое гатова дапамагаць іншым».

ЖАЛЕЗНЫ КУЛАК

Адна са звышзадач польскага боку — абвастрэнне ваеннай сітуацыі на граніцы з Беларуссю. Такое меркаванне выказаў ваенны эксперт Аляксандр Алесін на тэлеканале АНТ. «Відавочна, што адна са звышзадач, якія вырашае польскі бок, — абвастрэнне ваеннай сітуацыі, спроба справакаваць Беларусь на ваенныя падрыхтоўкі (можа, нават і Расію), прымусіць перамяшчаць буйныя масы войскаў, засяроджваць каля граніцы артылерыю, авіяцыю», — адзначыў Аляксандр Алесін.

Як вядома, на прыгранічнай тэрыторыі Польшча размясціла групоўку з 23 тысяч вайскоўцаў і бронетэхніку. Для іх на граніцы абсталявана 13 лагераў. На кансультацыі і запыты Беларусі Польшча ніяк не рэагуе. Тым не менш беларускі бок выверана рэагуе на гэтыя правакацыі польскага боку, у тым ліку прымяненне спецсродкаў у дачыненні да бежанцаў, зазначыў ваенны эксперт. Узброеныя Сілы Беларусі не разгарнулі на граніцы ніводнага ўзвода, аднак у арміі ёсць планы рэагавання на любое развіццё падзей на граніцы.

«Можа падацца, што мы праяўляем нейкую мяккацеласць. Але насамрэч у гэтай мяккай пальчатцы, як кажуць, жалезны кулак, — вобразна выказаўся эксперт. — Мы не зацікаўлены ў тым, каб даводзіць справу да супрацьстаяння двух ваенных блокаў: за Польшчай стаіць НАТА, за Беларуссю — АДКБ».

Польшча не проста правакуе Беларусь на граніцы, а праводзіць акты агрэсіі. Такое меркаванне выказаў намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па міжнародных справах Палаты прадстаўнікоў, старшыня Ліберальна-дэмакратычнай партыі Беларусі Алег Гайдукевіч на тэлеканале АНТ. Палітык перакананы, што Польшча спецыяльна стварыла крызіс на беларуска-польскай граніцы, каб узмацніць канфрантацыю з Беларуссю і Расіяй. Паводле яго слоў, рэакцыя беларускай дзяржавы на дзеянні польскага боку выверараная і адэкватная. «Мы не хочам канфлікту на граніцы. Мы ўсё робім, каб яго пазбегнуць», — падкрэсліў дэпутат.

Пётр ДУНЬКО.

ТЫМ ЧАСАМ

Мінабароны фіксуе пастаяннае павелічэнне інтэнсіўнасці палётаў разведвальнай і баявой авіяцыі краін — членаў НАТА ўздоўж дзяржаўнай граніцы Беларусі. Аб гэтым заявіў начальнік зенітных ракетных войскаў — начальнік упраўлення зенітных ракетных войскаў камандавання ВПС і войскаў ППА палкоўнік Сяргей Фралоў, паведаміла БелТА.

«Цяпер нашымі сродкамі радыётэхнічнай і радыёлакацыйнай разведкі фіксуецца пастаяннае павелічэнне інтэнсіўнасці палётаў разведвальнай і баявой авіяцыі краін — членаў НАТА ўздоўж дзяржаўнай граніцы Рэспублікі Беларусь, у тым ліку і ў паветранай прасторы Украіны. Так, за апошні час агульная колькасць палётаў павялічылася практычна ўдвая, у тым ліку колькасць палётаў разведвальнай авіяцыі. Пры гэтым неабходна адзначыць, што колькасць прыцягнутай авіяцыі ВПС ЗША павялічылася ў 1,5 раза», — адзначыў Сяргей Фралоў.

Акрамя таго, прадаўжаецца актыўнае выкарыстанне беспілотнай разведвальнай авіяцыі. «Мінімальнае аддаленне маршрутаў палётаў ад дзяржаўнай граніцы з Беларуссю складае 15—20 кіламетраў. Гэтыя факты пацвярджаюць нарошчванне ваеннай дзейнасці каля нашых граніц і сведчаць аб далейшай эскалацыі абстаноўкі вакол Рэспублікі Беларусь», — заўважыў Сяргей Фралоў.

Даслоўна

«Нельга не бачыць, што заходнія краіны выкарыстоўваюць міграцыйны крызіс на беларуска-польскай граніцы як новую падставу для напружання ў блізкім для нас рэгіёне, для націску на Мінск. І пры гэтым яны забываюцца на ўласныя абавязацельствы ў гуманітарнай сферы», — сказаў Прэзідэнт Расіі Уладзімір Пуцін, паведаміла ТАСС.

Уладзімір Пуцін таксама раскрытыкаваў Польшчу за прымяненне вадамётаў і слёзатачывага газу супраць мігрантаў з дзецьмі на польска-беларускай граніцы. «Давайце паглядзім, як польскія сілавікі паводзяць сябе на граніцы. Усё ж вы бачыце, глядзіце ў інтэрнэце і па тэлебачанні. Першае, што прыходзіць у галаву, — шкада дзяцей. Маленькія дзеці там, але не — паліваюць вадой, кідаюць гранаты са слёзатачывым газам», — адзначыў Уладзімір Пуцін.

Катаванні і прымяненне спецсродкаў

Інфармацыя аб злачынных дзеяннях Польшчы будзе накіравана ва ўсе міжнародныя арганізацыі

Аб гэтым заявіў Генеральны пракурор Беларусі Андрэй ШВЕД. Паводле яго слоў, прававы аналіз сітуацыі, якая склалася на беларуска-польскай граніцы, паказаў, што да гэтага часу службовымі асобамі Рэспублікі Польшча груба парушаюцца патрабаванні міжнароднага права, якое вызначае асноўныя грамадзянскія і палітычныя правы бежанцаў, а таксама грамадзян Беларусі.

«Прадпрымаюцца спробы і парушаецца недатыкальнасць дзяржаўнай граніцы нашай краіны. Здзяйсняюцца іншыя шматлікія супрацьпраўныя дзеянні супраць чалавецтва, — сказаў Андрэй Швед. — Прадстаўнікі ўлады Польшчы неаднаразова ажыццяўлялі і ажыццяўляюць зараз незаконную дэпартацыю, катаванні і акты жорсткасці ў дачыненні да бежанцаў. Так, пры іх прыбыцці да дзяржаўнай граніцы Польшчы сілавікамі гэтай дзяржавы ажыццёўлены і рэалізоўваюцца неадэкватныя і відавочна неадпаведныя арганізацыйныя і тэхнічныя мерапрыемствы па перашкаджэнні праходу бежанцамі ў Германію. У прыватнасці, устаноўлены дадатковыя загароды, уведзены ваенізаваныя ўзброеныя патрулі, ачапленне; прыменены пагрозлівыя палёты авіятэхнікі, танкі, іншае цяжкае ўзбраенне ў непасрэднай блізкасці ад мірных бежанцаў, якія знаходзяцца на тэрыторыі Беларусі».

Генпракурор падкрэсліў, што бежанцы неаднаразова і публічна заяўлялі аб сваім статусе, мэтах, маршруце руху ў Германію. Пра што дакладна вядома ўладам Польшчы. «Нягледзячы на гэта, польскія сілавікі ў дачыненні да мірных і безабаронных людзей, у тым ліку ў начны час сутак, прымянялі катаванні і іншыя акты жорсткасці, спецыяльныя сродкі, атрутныя рэчывы, асвятленне, якое слепіць вочы, дэманстрацыйныя стрэлы ў паветра і выбухі, фізічную сілу. Толькі 15—16 лістапада зафіксаваны і задакументаваны шматлікія факты незаконнай дэпартацыі бежанцаў з тэрыторыі Польшчы, прымяненне ў дачыненні да іх вадамётаў, якія змяшчаюць хімічныя прымесі пры тэмпературы навакольнага асяроддзя не больш за 4 градусы, святлошумавых гранат і газу з таксічнымі рэчывамі, у тым ліку ў адносінах да жанчын, якія маюць прыкметы цяжарнасці, і малалетніх дзяцей», — адзначыў ён.

Цялесныя пашкоджанні нанесены прадстаўнікам сродкаў масавай інфармацыі Беларусі, Расіі, Катара, службовым асобам органаў пагранічнай службы нашай краіны. «Кожны факт учынення злачынных дзеянняў службовых асоб Польшчы, у тым ліку на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, фіксуецца, дакументуецца аб'ектыўна і бесстаронна падчас расследаванняў узбуджанай напярэдадні крымінальнай справы аб злачынствах супраць бяспекі чалавецтва, учыненых польскімі сілавікамі і іншымі прадстаўнікамі ўлады гэтай краіны. Рэалізоўваюцца актыўныя меры па ідэнтыфікацыі кожнай службовай асобы, якая здзейсніла канкрэтныя злачынныя дзеянні ў дачыненні да безабаронных людзей. Зараз польскія сілавікі і іншыя службовыя асобы хаваюцца за нагрувашчваннем калючага дроту, металічнымі бар'ерамі, танкамі, браневікамі, 15 тысячамі ўзброеных да зубоў вайскоўцамі. Усё вышэйпададзенае і іншыя цынічныя злачынныя дзеянні, якія ў цяперашні час дакументуюцца праваахоўнымі органамі Беларусі, здзейснены па прамым указанні альбо са згоды палітычнага кіраўніцтва Польшчы: яе прэзідэнта Анджэя Дуды, прэм'ер-міністра Матэуша Маравецкага, міністра нацыянальнай абароны Марыюша Блашчака і іншых вышэйшых службовых асоб», — канстатаваў Андрэй Швед.

Генпракурор нагадаў, што злачынствы супраць чалавецтва ў адпаведнасці з міжнароднымі нормамі і правіламі не маюць тэрміну даўнасці і вінаватыя асобы падлягаюць прыцягненню да крымінальнай адказнасці, — заявіў ён. — Акрамя таго, намі зафіксавана неаднаразовае публічнае выступленне шэрагу грамадзян Польшчы, у тым ліку службовых асоб, з заклікамі ажыццявіць агрэсію Польшчы ў дачыненні да Рэспублікі Беларусь. У дадзеным выпадку размова ідзе аб наяўнасці саставу прыкметы злачынства, прадугледжанага арт. 123 Крымінальнага кодэкса нашай краіны, а менавіта «прапаганда вайны». У сувязі з гэтым Генеральнай пракуратурай распачата крымінальная справа, расследаванне якой даручана Следчаму камітэту Беларусі. Адпаведная інфармацыя аб злачынных дзеяннях, учыненых вышэйшымі службовымі асобамі Польшчы, будзе накіравана для дачы прававой ацэнкі ва ўсе міжнародныя арганізацыі, уключаючы Арганізацыю Аб'яднаных Нацый, Савет Еўропы і іншыя», — сказаў на заканчэнне Андрэй Швед.

Паводле БелТА.

Фота БелТА.

Экспертыза

Прымяняліся хімічныя рэчывы раздражняльнага характару

Дзяржаўным камітэтам судовых экспертыз працягваецца правядзенне судовых экспертыз, прызначаных Следчым камітэтам Беларусі па крымінальнай справе, узбуджанай па арт. 128 КК. Аб гэтым паведаміў начальнік аддзела ўзаемадзеяння са СМІ ДКСЭ Сяргей ЦІТАВЕЦ.

У ходзе даследавання аб'ектаў, канфіскаваных 16 лістапада пры аглядзе месца здарэння — участка беларуска-польскай граніцы ў раёне пункта пропуску «Брузгі» на тэрыторыі Беларусі, судовыя эксперты Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз выявілі рэчыва, якое ўяўляе сабой выцяжку алкалоідаў стручковага перцу.

Як расказаў Сяргей Цітавец, гэта рэчыва прымяняецца для камплектацыі спецсродкаў, якія знаходзяцца на ўзбраенні арміі і паліцыі, а менавіта газавых гранат, патронаў для газавай зброі, розных аэразольных прыстасаванняў, у тым ліку вадамётаў.

Пры трапленні на скуру, слізістыя абалонкі і ў дыхальныя шляхі рэчыва выклікае моцнае запаленне, выяўленыя болевыя адчуванні, спазм вочных мышцаў і слёзацёк, а таксама кашаль, у вялікіх канцэнтрацыях выклікае апёкі слізістай, вачэй і скуры.

Таксама судовыя эксперты на прадстаўленых аб'ектах выявілі напластаванні інсектыцыду дэльтаметрыну, які з'яўляецца таксічным рэчывам.

Аднымі з аб'ектаў, якія паступілі для правядзення выбухатэхнічнай экспертызы, з'яўляюцца фрагменты святлошумавых гранат.

У Дзяржаўным камітэце судовых экспертыз праведзена больш як 30 судова-медыцынскіх экспертыз у адносінах да асоб, у тым ліку чатырох жанчын і аднаго дзіцяці 2007 года нараджэння, якія звярнуліся па медыцынскую дапамогу з-за цялесных пашкоджанняў, прычыненых ім 16 лістапада на ўчастку беларуска-польскай граніцы. Усе падэкспертныя скардзіліся на рэзь у вачах, пяршэнне і боль у горле. У некаторых людзей выяўлены пашкоджанні скуры.

«У выніку судова-медыцынскіх экспертыз устаноўлена, што ў асоб, якія звярнуліся па медыцынскую дапамогу, цялесныя пашкоджанні ўтварыліся ад уздзеянняў хімічных сродкаў, што маюць раздражняльную ўласцівасць», — адзначыў Сяргей Цітавец.

У дзяржкамітэт працягваюць паступаць аб'екты, забраныя пры аглядзе месца здарэння, для правядзення ў тым ліку выбухатэхнічных і хімічных экспертыз, прызначаных Следчым камітэтам Беларусі. Судовыя эксперты таксама праводзяць судова-медыцынскія экспертызы асоб, якія звярнуліся са скаргамі на здароўе ў выніку прымянення ў адносінах да іх хімічных рэчываў раздражняльнага характару.

Гарачая тэма

ЗБЕРАГЧЫ ЗДАРОЎЕ ЎСІХ

З-за выпадку заражэння каранавіруснай інфекцыяй у лагеры бежанцаў адкрыты пункт вакцынацыі

Такое пажаданне выказалі самі бежанцы. Для гэтага абсталявана асобнае памяшканне, дзе будзе таксама аказвацца і першасная медыцынская дапамога. Пункт абсталяваны пад амбулаторыю. Людзям раздаюць маскі.

За мінулыя суткі па медыцынскую дапамогу звярнулася каля сарака чалавек, некалькі з іх шпіталізаваны. Адзін з бежанцаў пашкодзіў галенастоп. Яму аказана медыцынская дапамога. Але ёсць і больш сур'ёзныя выпадкі.

18 лістапада брыгада хуткай дапамогі даставіла ў прыёмнае аддзяленне з беларуска-польскай граніцы 25-гадовага грамадзяніна Ірака Закарыя Хагі Мустафу. Ён скардзіўся на болі ў вобласці паясніцы. Таксама ў яго была высокая тэмпература. Пасля таго як урачы правялі ўльтрагукавое абследаванне, зрабілі аналіз і паставілі дыягназ, яго адразу накіравалі ў аперацыйную. Аказалася, што патрэбна неадкладнае выдаленне каменя з мачаточніка. Закарыя паспяхова прааперыравалі і ўстанавілі стэнт. Як зазначылі ў Гродзенскай бальніцы хуткай дапамогі, аперацыя была зроблена своечасова, і жыццю пацыента нічога не пагражае. Ён праходзіць лячэнне ў аддзяленні ўралогіі.

Таксама аказана медыцынская дапамога цяжарнай жанчыне, якая паступіла ў Гродзенскі абласны перынатальны цэнтр. Тут яна атрымала кансультацыю, а затым вярнулася да сваёй сям'і на граніцу. Увогуле, да медыкаў брыгады хуткай дапамогі, што дзяжураць у лагістычным цэнтры, бежанцы звяртаюцца пастаянна. Усе атрымліваюць патрэбныя кансультацыі.

Медыцынская дапамога аказваецца і дзецям. Як расказалі ў Гродзенскай абласной клінічнай бальніцы, умовы, у якіх апынуліся бежанцы на беларуска-польскай граніцы, — велізарная рызыка для іх здароўя. Зараз у бальніцы праходзяць лячэнне чацвёра дзяцей з іх ліку. Яны знаходзяцца разам са сваімі маці. З кішэчнай інфекцыяй даставілі хлопчыка ва ўзросце 2,5 года. Пацыенту з Ірака правялі неабходны комплекс дыягностыкі, вядзецца лячэнне. Як расказалі ў дзіцячай бальніцы, ёсць станоўчая дынаміка, стан маленькага пацыента здавальняльны.

Днямі паступілі ў дзіцячую бальніцу і двое брацікаў, малодшаму ўсяго чатыры месяцы, старэйшаму — няма і двух гадоў. З-за доўгага знаходжання ў халодных умовах у малодшага развіўся абструктыўны бранхіт, другі — з сімптомамі віруснай рэспіратарнай інфекцыі. Сям'я заставалася ў палатачным лагеры, хоць малодшаму дзіцяці станавілася горш. Медыкам удалося ўгаварыць маці пакінуць лагер і ехаць у бальніцу. Зараз стан пацыентаў палепшыўся, яны атрымліваюць неабходнае лячэнне.

Пад пагрозай — і жыццё дзесяцігадовага хлопчыка з Сірыі. Яго, можна сказаць, падабралі беларускія пагранічнікі зусім знясіленага. Казалі, што ён адзінока хадзіў па лагеры, а часцей ляжаў на зямлі. Аказалася, што адстаў ад сям'і, ніхто з дарослых яго не даглядаў. У хлопчыка былі ўсе прыкметы пераахаладжэння, абязводжвання і галадання. Напачатку яго агледзелі медыкі хуткай дапамогі, затым накіравалі ў стацыянар. У бальніцы аказалі медыцынскую дапамогу, а галоўнае — накармілі і сагрэлі, дзіця стала адчуваць сябе лепш. Хлопчыка выпісалі з бальніцы.

Па розных ацэнках, сярод дзвюх тысяч бежанцаў знаходзіцца больш за 500 дзяцей, многім з якіх няма і двух гадоў. Увесь гэты час дзеці праходзяць праз усе іспыты разам з дарослымі.

Не вытрымліваюць такіх умоў жыцця і дарослыя. Адна з бежанак страціла прытомнасць проста на пункце пропуску. Яна да апошняга заставалася каля КПП і не згаджалася перайсці ў лагістычна-транспартны цэнтр, куды перамясцілася асноўная частка іракскіх бежанцаў.

У чацвер стыхійны лагер каля КПП пачаў знікаць, групы мігрантаў адна за адной перасяліліся ў лагістычна-транспартны цэнтр, дзе для іх падрыхтаваны другі паверх. Ім выдаюцца коўдры і матрацы.

У лагеры бежанцаў асаблівая ўвага аддаецца сітуацыі з пандэміяй.

— Выяўлены хворы на каранавірусную інфекцыю. Яго накіравалі на лячэнне ў Гродзенскую ўніверсітэцкую клініку. Бежанцы выказалі жаданне вакцынавацца. Мы разумеем, што інфекцыя можа паралізаваць работу ўсяго лагера, таму, па ўзгадненні з Міністэрствам аховы здароўя, гатовы рабіць прышчэпкі кітайскай вакцынай, каб захаваць бяспеку для ўсіх, хто тут знаходзіцца, а таксама валанцёраў і тых, хто аказвае дапамогу бежанцам, — зазначыў **намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Віктар ПРАНЮК.**

Паколькі ў цэнтры сканцэнтравана вялікая колькасць людзей, ім прапаноўваецца выкарыстоўваць маскі. Сюды прывезлі 10 тысяч медыцынскіх масак, якія раздалі бежанцам.

На тэрыторыі лагістычнага цэнтра арганізаваны пункт вакцынацыі. Для гэтага выдзелілі спецыяльнае памяшканне, тут будзе працаваць і стацыянарны пункт медыцынскай дапамогі. Ён поўнасцю абсталяваны для работы. Бежанцы атрымаюць першасную медыцынскую кансультацыю пры звароце, а медыкі будуць прымаць рашэнні і аб адпраўцы іх у медыцынскія ўстановы. Ажыццяўляць вакцынацыю будуць супрацоўнікі гарадской паліклінікі № 7.

Маргарыта УШКЕВІЧ.

Полюс інтарэсаў

АНТАРКТЫДА НАС ЧАКАЕ

У Нацыянальнай акадэміі навук дадзены старт 14-й Беларускай экспедыцыі

На лядовы кантынент адправяцца 11 чалавек пад кіраўніцтвам нязменнага кіраўніка ўсіх беларускіх антарктычных экспедыцый Аляксея ГАЙДАШОВА. У складзе экспедыцыі навуковыя супрацоўнікі НАН Беларусі (Рэспубліканскага цэнтра палярных даследаванняў, Інстытута фізікі, Аб'яднанага інстытута праблем інфарматыкі, НПЦ НАН Беларусі па біярэсурсах), БДУ (Нацыянальнага навукова-даследчага цэнтра маніторынгу азонасферы) і іншых арганізацый краіны.

У камандзе — як вопытныя спецыялісты, якія ўжо пабывалі ў Антарктыдзе (восем чалавек), так і трое навічкоў: Аляксей Гайдашоў — начальнік экспедыцыі; Аляксей Хаткевіч — начальнік сезоннай палявой базы; Уладзімір Несцяровіч — механік; Ягор Корзун — біёлаг-эколаг; Сяргей Люты — вядучы спецыяліст, загадчык вытворчасці харчавання; Ігар Аляксееў — навуковы супрацоўнік (фізіка атмасферы); Сяргей Пунінскі — урач-хірург; Аляксандр Абатурын — электрык, спецыяліст па сродках УКХ і КВ-сувязі; Юрый Падшывалаў — навуковы супрацоўнік, метэаролаг; Мікалай Зінькевіч — праграміст; Артур Івашка — інжынер.

Членаў экспедыцыі чакае нялёгкая шматмесячная работа ўдалечыні ад Радзімы па нарошчванні будаўніцтва ўласнага дома на берагах Антарктыкі — Беларускай антарктычнай станцыі «Гара Вячэрняя», а таксама па правядзенні навуковых даследаванняў у рамках новай дзяржаўнай праграмы па вывучэнні Антарктыкі.

Як падкрэсліў **першы намеснік старшыні Прэзідыума НАН Беларусі акадэмік Сяргей ЧЫЖЫК,** асноўная мэта цяперашняй экспедыцыі — атрыманне новых значных навуковых вынікаў: «Нашымі навукоўцамі ўжо атрыманы важныя вынікі ў галіне даследавання Антарктычнага кантынента. Гэта адкрыццё новых для навукі відаў бесхрыбетных і ацэнка іх прамысловых запасаў; стварэнне эталоннай калекцыі мхоў і лішайнікаў, якая з'яўляецца навуковым аб'ектам — Нацыянальным здабыткам Рэспублікі Беларусь; абгрунтаванне перспектыў раёна размяшчэння Беларускай антарктычнай станцыі на карысныя выкапні; стварэнне базавага апаратурнага комплексу для эксперыментальнай дыстанцыйнай наземнай і спадарожнікавай сістэмы маніторынгу атмасферы і снежнай паверхні; стварэнне радыеметрычнай сістэмы, якая ўключана ў глабальную радыеметрычную сетку AERONET. І гэта не поўны пералік дасягненняў, якія атрыманы нашымі вучонымі падчас знаходжання на паўднёвым полюсе Зямлі».

Аднак, як падкрэсліў Сяргей Чыжык, у час экспедыцыі неабходна прыкласці яшчэ нямала сіл, каб вынікі даследаванняў у Антарктыцы мелі значнасць для ўсёй краіны. «Патрабуецца арганізацыя новых даследаванняў унікальнага біялагічнага патэнцыялу Антарктыкі для выяўлення найбольш актыўных ферментаў, якія можна было б выкарыстаць у мэтах распрацоўкі новых відаў лекавых прэпаратаў шырокага спектра дзеяння (проціпухлінных, супраць гіпертаніі і іншых); па пошуку і вывучэнні ўнікальных геалагічных аб'ектаў і карысных выкапняў, новых даных аб будове зямной кары БАС і іншых», — адзначыў Сяргей Чыжык.

Па словах начальніка 14-й Беларускай антарктычнай экспедыцыі Аляксея Гайдашова, запланаваная экспедыцыя будзе найбольш ёмістая па навуковых напрамках. «Акрамя шасці асноўных напрамкаў, якія ўвайшлі ў праграму навуковых даследаванняў, кожны супрацоўнік мае свае навуковыя заданні», — адзначыў ён.

Ужо сёння, 19 лістапада, члены 14-й Беларускай антарктычнай экспедыцыі авіяцыйным шляхам адправяцца ў Кейптаўн. Пасля двухтыднёвага каранціну таксама авіяцыйным шляхам іх даставяць да месца базіравання ў Антарктыду.

Надзея НІКАЛАЕВА.
Фота НАН.

АД МАСКВЫ ДА БРЭСТА

У Брэсце адзначылі 150-гадовы юбілей чыгуначных зносін на маршруце Масква — Брэст

16 лістапада 1871 года са станцыі Мінск адправіўся першы таварна-пасажырскі поезд у Брэст. Адначасова з ім другі поезд з Мінска накіраваўся ў Маскву. За паўтара стагоддзя паміж Брэстам і Масквой было перавезена каля 30 мільёнаў пасажыраў і мільярды тон грузаў, гэты маршрут стаў надзейным і запатрабаваным участкам ІІ Агульнаеўрапейскага транспартнага калідора.

Названую падзею адзначылі ў Брэсце з удзелам кіраўнікоў беларускай і расійскай чыгункі, прадстаўнікоў органаў улады і грамадскасці. Напачатку адбылася невялікая тэатралізаваная дзея, якая нагадала прысутным гістарычныя падзеі. Як вядома, першапачаткова шлях ад Смаленска да Брэста планавалі пракласці праз Магілёў, Бабруйск, Пінск. Але гэтую ідэю не падтрымалі ваенныя аўтарытэты той пары — ваенны міністр Дзмітрый Мілюцін і інжынер Эдуард Татлебен. Яны разглядалі дарогу найперш з пункту гледжання дастаўкі грузаў і жывой сілы на выпадак вайны, а землі Бабруйскага і Пінскага паветаў сярод лясоў і балот менеш падыходзілі для тэатра ваенных дзеянняў. Апошняе слова засталося за імператарам Аляксандрам ІІ, які выслухаў усе пункты гледжання і сваёй рэзалюцыяй вырашыў чыгуначны лёс на карысць Мінска. Дарогу, дарэчы, пабудавалі ў рэкордна кароткі тэрмін — за паўтара года замест трох.

Фота Валерыя КАРАЛЯ.

А праз 15 гадоў, 28 мая 1886-га, адбылося ўрачыстае адкрыццё вакзала ў Брэсце, дзе прысутнічалі цар Аляксандр ІІІ з царыцай Аляксандрай Фёдараўнай і царэвічам Мікалаем.

— Гэтая дарога бачыла на сваім вяку войны і рэвалюцыі, была сведкай трагічных і радасных падзей і заўсёды служыла людзям. Яна запатрабавана нашымі дзяржавамі і вырашае задачы развіцця кантынента, — сказаў на адкрыцці ўрачыстага мерапрыемства **начальнік Беларускай чыгункі Уладзімір МАРОЗАЎ.**

Пра важнае для абодвух дзяржаў эканамічнае і грамадска-палітычнае значэнне чыгуначных зносін гаварыў у сваёй кароткай прамове **старшыня Брэсцкага абласнога выканаўчага камітэта Юрый ШУЛЕЙКА.**

Штогод больш за 1,2 мільёна жыхароў Беларусі і Расіі здзяйсняюць паездкі па гэтым напрамку. Аб'ём перавозак грузаў паміж дзвюма краінамі ў 2020 годзе склаў 41,3 мільёна тон.

У канцы ўрачыстасці Юрый Шулейка, Уладзімір Мароза, Сяргей Паўлаў і намеснік міністра сувязі і інфарматызацыі Наталля Гардзеенка правялі цырымонію гашэння маркі «150 гадоў чыгуначнай магістралі Смаленск — Мінск — Брэст».

Усе прысутныя змаглі наведаць выстаўку, прысвечаную развіццю чыгуначных зносін на беларускай зямлі. Азнаёміцца з ёй можна ў зале чакання станцыі Брэст-Цэнтральны.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

Блізкая ўлада

Выканкамы на сувязі

Практыка правядзення прамых ліній рэгіянальнай вертыкалі працягваецца. Калі ў вас ёсць пытанні або праблемы, якія патрабуюць умяшання органаў улады, тэлефануйце.

Тэлефонныя лініі ў суботу, 20 лістапада, з 9.00 да 12.00 правядуць:

- намеснік старшыні Брэсцкага аблвыканкама Генадзь Іосіфавіч БАРЫСЮК. Тэл. 8 016 221 31 21;
- намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама Уладзімір Пятровіч ПЕНІН. Тэл. 8 021 222 22 22;
- старшыня Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў Кацярына Анатольеўна ЗЕНКЕВІЧ. Тэл. 8 023 233 12 37;
- намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Віктар Францавіч ПРАНЮК. Тэл. 8 015 273 56 44;
- намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Сяргей Мікалаевіч МАСЛАЎ. Тэл. 8 022 250 18 69;
- намеснік старшыні Мінскага аблвыканкама Аляксандр Уладзіміравіч КРУЧАНАЎ. Тэл. 8 017 500 41 60;
- старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў Андрэй Аляксандравіч БУГРОЎ. Тэл. 8 017 222 44 44.

Вечар дружбы

РУДАКІ Ў БЕЛАРУСІ

У Мінску ў Доме дружбы прайшоў вечар, прысвечаны 1080-годдзю з дня смерці таджыкска-персідскага паэта Абу Абдула Рудакі.

І невыпадковым з'яўляецца ўдзел у імпрэзе паслоў адразу дзвюх краін — Таджыкістана і Ірана: Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла Рэспублікі Таджыкістан спадара Махмадшарыфа Хакдода і Надзвычайнага Пасла Ісламскай Рэспублікі Іран спадара Саіда Яры. Рудакі прыналежны Усходу, як прыналежны ўсяму свету.

І спадар пасол Таджыкістана, і старшыня прэзідыума Беларускага таварыства дружбы і культурных сувязяў з замежнымі краінамі Ніна Іванова, і кіраўнік іранскай дыпламатычнай місіі — усе гаварылі пра веліч постаці Рудакі, пра яго здольнасць яднаць народы і культуры краін Сярэдняй Азіі, увогуле краін Усходу.

На вечары на розных мовах — па-таджыкску, па-беларуску і па-руску — гучалі вершы самога Рудакі. Творы паэта, асветніка чыталі студэнты розных ВНУ беларускай сталіцы. Па-таджыкску — велічна, узнёсла, эмацыянальна — вершы гучалі ў выкананні юных таджыкаў: Рамазана Латкова, Негоры Шарыпавай, Тахміны Маўлонавай. Таджыкскія студэнты вучацца на энергетычным і архітэктурным факультэтах Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта. У ВНУ працуе Цэнтр культуры, адукацыі і навукі Рэспублікі Таджыкістан, які ўзначальвае Вячаслаў Пятровіч Лугавы.

На вечарыне згадвалася і пра тое, што паэзія Рудакі знаёмая беларусам у перакладах Сяргея Грахоўскага. А з найбліжэйшых па часе перакладаў вядомыя ў пераўвасабленні твораў класіка, здзейсненыя лаўрэатам Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь Міколам Мятліцкім. І яны таксама гучалі ў Доме дружбы.

Сяргей ШЫЧКО.

Надвор'е

Сыра і ветрана

Да нас завітае ранняе перадзімʼе

Да канца тыдня праз нашу краіну працягнуць ссоўваюцца атмасферныя франты ад скандынаўскіх цыклонаў, якія забяспечваюць паступленне цёплай няўстойлівай павятранай масы.

У суботу будзе воблачна з прасяненнямі. Уначы і раніцай на большай частцы краіны пройдуць дажджы, удзень месцамі кароткачасовыя дажджы. У многіх раёнах чакаецца ўзмацненне ветру парывамі да 15—20 м/с. Тэмпература паветра ўначы складзе ад плюс 2 градусаў па паўночным усходзе краіны да 10 градусаў вышэй за нуль па паўднёвым захадзе. Удзень будзе па-асеняняму цёпла — 5—11 цяпла.

Крыху сапсуецца надвор'е ў нядзелю. У гэты дзень будзе воблачна. Часам будуць ісці дажджы, увечары па поўначы краіны магчымы мокры снег. Вецер прагназуецца паўднёва-заходні парывісты, месцамі моцны парывісты. Тэмпература паветра ўначы складзе ад нуля да плюс 7 градусаў, па паўднёвым захадзе — да 9 цяпла. Удзень — ад плюс 4 градусаў да 11 градусаў вышэй за нуль.

Паводле папярэдняга прагнозу айчынных сіноптыкаў, на наступным тыдні захаваецца няўстойлівы характар надвор'я. Тэмпературны фон пачне паніжацца, а дажджы будуць чаргавацца з мокрым снегам. Ёсць верагоднасць, што ў Беларусі ўсталюецца часовае снежнае покрыва. Сітуацыю на дарогах могуць ускладніць туман і галалёдныя з'явы. У панядзелак уначы на большай частцы тэрыторыі, а ўдзень месцамі па краіне пройдуць ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу. Месцамі чакаецца туман, слабы галалёд. Тэмпература паветра на працягу сутак складзе ад мінус 1 градуса да 6 цяпла.

Пачынаючы з аўторка на тэрыторыю нашай краіны завітае ранняе перадзімʼе. У гэтыя суткі ўначы будзе пераважна без ападкаў, раніцай і ўдзень месцамі па краіне пройдзе кароткачасовы снег, мокры снег, магчымы слабы галалёд. На асобных участках дарог чакаецца галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе 2—9 марозу, удзень — ад мінус 3 градусаў да 3 цяпла.

Сяргей КУРКАЧ.

Фінансы

Дэфіцыт бюджэту будзе мінімальны

Гэтага ўдасца дасягнуць, не памяншаючы сродкі на медыцыну, звязаныя з пандэміяй

Паводле слоў міністра фінансаў нашай краіны Юрыя СЕЛІВЕРСТАВА, дэфіцыт рэспубліканскага бюджэту сёлета складзе 3 млрд рублёў. Даходы рэспубліканскага бюджэту па выніках года складуць 26,9 млрд рублёў, а выдаткі — 29,9 млрд рублёў. Такім чынам, дэфіцыт складзе каля 3 млрд рублёў, што ў два разы менш за ўдакладнены план.

Юрый Селіверстаў адзначыў, што гэты паказчык зніжаны, нягледзячы нават на тыя дадатковыя выдаткі, якія панесла дзяржава. А асноўныя з іх звязаны з падтрымкай сістэмы аховы здароўя ў сувязі з COVID-19: выплата ковідных надбавак медыкам, закупка медыкаментаў і іншыя медыцынскія выдаткі. Таксама на працягу года аказвалася дадатковая падтрымка агрэпрамысловаму комплексу. У Міністэрстве фінансаў рыхтуецца праект удакладненняў у бюджэт, і ў найбліжэйшы час ён будзе ўнесены на разгляд ва ўрад. Мяркуецца, што ў праекце ўсе дадатковыя даходы і выдаткі будуць збалансаваны.

Добры прафіцыт, але часовы

За студзень — кастрычнік гэтага года даходы кансалідаванага бюджэту склалі 39,1 млрд рублёў, або 92,8 % удакладненага гадавога плана. Выдаткі кансалідаванага бюджэту прафінансаваныя ў аб'ёме 36,8 млрд рублёў, што складае 75,9 % удакладненага гадавога плана. Па выніках выканання кансалідаванага бюджэту сфарміраваны прафіцыт у памеры 2,3 млрд рублёў.

Такі значны прафіцыт кансалідаванага бюджэту склаўся ў асноўным за кошт станоўчага мясцовага бюджэту. Гэтыя бюджэты за 10 месяцаў года зарабілі 21,7 млрд рублёў, у той жа час іх выдаткі склаліся ў суму, роўную 19,7 млрд рублёў. Як бачым, сумарны прафіцыт мясцовых бюджэтаў склаў 2 млрд рублёў.

Нядрэнна спрацаваў па выніках студзеня — кастрычніка і рэспубліканскі бюджэт. Ён атрыманы з прафіцытам у памеры 300 млн рублёў (даходы — 23,2 млрд рублёў, выдаткі — 22,9 млрд рублёў). Гэта звязана з паступленнем квартальных плацяжоў (у тым ліку адначасовых падаткаў).

«Але да канца года такога аб'ёму дадатковых плацяжоў ужо не будзе. А раўнамерныя выдаткі застаюцца, да канца года яны нават нарастаюць. Мы яшчэ будзем аказваць дадатковую падтрымку рэгіёнам на барацьбу з COVID-19 — каля 400 млн рублёў за гэты квартал яшчэ будзе выплачана, у тым ліку на набыццё лекаў і вакцын. Акрамя таго, да канца года нарастаюць выдаткі ў будаўніцтве, таму што людзі выконваюць адпаведныя работы і прад'яўляюць іх да фінансавання. Гэтак жа фінансуецца і праца навукоўцаў», — адзначыў міністр.

Выдаткі паскорана растуць за кошт сацыяльнай сферы

Міністр адзначыў, што за 10 месяцаў выдаткі рэспубліканскага бюджэту прафінансаваныя амаль на 23 млрд рублёў, або 75,2 % удакладненага гадавога плана. У той жа час у параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года выдаткі павялічыліся на 13 % (за студзень — кастрычнік 2020 года яны склалі 20,2 млрд рублёў).

Усе сацыяльныя абавязацельствы выкананы: зарплаты, пенсіі, дапамогі і стыпендыі выплачваюцца ў поўным аб'ёме і ў тэрмін.

Што датычыцца сацыяльнай сферы (ахова здароўя, фізічная культура і спорт, культура, сродкі масавай інфармацыі, адукацыя, сацыяльная палітыка), то яна прафінансаваная ў суме 4,4 млрд рублёў, або 78,6 % удакладненага гадавога плана. У структуры фінансавання сацыяльнай сферы 63,1 % займаюць выдаткі, звязаныя з аплатай працы работнікаў і сацыяльнымі выплатамі насельніцтву. Агульны аб'ём такіх выдаткаў склаў 2,8 млрд рублёў. Бюджэту фонду сацыяльнай абароны насельніцтва перададзены трансферт з рэспубліканскага бюджэту ў суме 983,7 млн рублёў, або 60,4 % удакладненага гадавога плана.

У параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года выдаткі на сацыяльную сферу павялічыліся на 19,5 % (за студзень — кастрычнік 2020 года выдаткі склалі 3,7 млрд рублёў), трансферт з рэспубліканскага бюджэту павялічыўся на 4,9 % (за студзень — кастрычнік мінулага года выдаткі склалі 937,6 млн рублёў).

З крэдыторамі мы сябруем

Міністр падкрэсліў, што наша дзяржава самадастатковая: нам цалкам па сілах абслугоўванне сваіх даўгоў. За 10 месяцаў года выдаткі, звязаныя з абслугоўваннем дзяржаўнай запазычанасці, склалі 2,1 млрд рублёў (808,3 млн долараў ЗША ў пераліку), або 70,0 % удакладненага гадавога плана. Плацяжы ўнутраным і знешнім крэдыторам выконваюцца своечасова і ў поўным аб'ёме.

На выплату дзяржаўнай запазычанасці накіравана 4 354,2 млн

рублёў у эквіваленце (1 651,4 млн долараў ЗША) (выплата замежнай дзяржаўнай запазычанасці склала 3 712,0 млн рублёў (1 452,5 млн долараў ЗША), выплата ўнутранай дзяржаўнай запазычанасці — 642,2 млн рублёў (198,9 млн долараў ЗША)).

Больш за 35 % даходаў бюджэту — падаткі малога і сярэдняга бізнесу

Пра гэта паведаміў **першы намеснік міністра па падатках і зборах Беларусі Ігар КЛЕПЧА.**

Паводле яго слоў, падатковая служба сёння фарміруе практычна 70 % дзяржаўнага бюджэту, у тым ліку каля 50 % рэспубліканскага і ў поўным аб'ёме мясцовыя бюджэты. За дзевяць месяцаў больш за палову паступленняў, якія кантралююцца падатковымі органамі, сфарміраваныя за кошт арганізацый недзяржаўнага сектара эканомікі. Па ўсіх катэгорыях суб'ектаў гаспадарання назіраецца рост у параўнанні з узроўнем мінулага года. Калі разглядаць структуру плацельшчыкаў падаткаў у разрэзе маштабу бізнесу, больш за 80 % адносяцца да суб'ектаў малога і сярэдняга бізнесу. Імі забяспечваецца 35 % даходаў бюджэту.

Ігар Клепча ўпэўнены, что найбольш прывабным рэжымам на працягу доўгага часу з'яўляецца спрошчаная сістэма падаткаабкладання. Без малога 60 % суб'ектаў гаспадарання выкарыстоўваюць дадзены рэжым. За дзевяць месяцаў ад гэтай катэгорыі плацельшчыкаў паступіла каля 5 % даходаў бюджэту, якія кантралююцца падатковымі органамі.

Першы намеснік міністра адзначыў, што ў бягучым годзе павялічылася колькасць рэзідэнтаў Парка высокіх тэхналогій. Яна ўжо перавысіла 1 тысячу. Сума выплачаных імі падаткаў павялічылася больш чым у 1,5 раза і за 9 месяцаў склала каля 540 млн рублёў. «Гэта 2,3 % ад даходаў бюджэту, якія кантралююцца падатковымі органамі», — сказаў Ігар Клепча.

«За апошнія гады падатковай службай выбудаваная эфектыўная сістэма збору падаткаў у бюджэт усіх узроўняў. Як вынік — выраслa доля плацяжоў, выплачаных у добраахвотным парадку. У бягучым годзе яна складае практычна 98,8 % — гэта адзін з самых высокіх паказчыкаў за апошнія 10 гадоў. У сваю чаргу запазычанасць па падатках і зборах дзеючых суб'ектаў гаспадарання і фізічных асоб па адносінах да плановых даходаў бюджэту на працягу шэрагу гадоў не перавышае 0,5 %», — падкрэсліў Ігар Клепча.

Падатак на звышпрыбытак пакуль не ўвядуць

Першы намеснік міністра фінансаў Дзмітрый КІЙКО адзначыў, што, нягледзячы на чуткі аб магчымым увядзенні «падатку на багацце», увядзенне прагрэсіўнай шкалы ставак падаходнага падатку цяпер не разглядаецца.

«На сёння нейкія істотныя змены падатковай мадэлі ў частцы дадатковага падаткаабкладання звышспажывання альбо прагрэсіўнай шкалы ставак падаходнага падатку намі не разглядаюцца. Мы лічым, што яны не дадуць значных фіскальных эфектаў, у тым ліку ў сувязі з тым, што ў нас у Беларусі невялікае маёмаснае расслаенне, у тым ліку па даходах грамадзян. Акрамя таго, можа ўскладніцца падатковае адміністраванне», — сказаў Дзмітрый Кійко.

На думку Мінфіна, падатковая сістэма павінна трансфармавацца ў частцы пашырэння падатковай базы. Гэта ўцягванне ў падаткаабкладанне тых абаротаў, якія сёння па пэўных прычынах не трапляюць пад асноўныя падаткі. Напрыклад, электронны гандаль з замежных гандлёвых пляцовак. «З наступнага года падатак на дабаўленую вартасць на электронны гандаль мы пашыраем і на нерэзідэнтаў. Другі асноўны напрамак — удасканаленне парадку прымянення падатковых ільгот і іх скарачэнне. Пры гэтым мы не забываемся пра тое, што павінны захоўвацца стымуляцыйныя меры, якія будуць падтрымліваць і забяспечваць эканамічны рост краіны», — адзначыў першы намеснік міністра фінансаў.

Адказваючы на пытанні журналістаў, Юрый Селіверстаў злёгку закрануў міграцыйную праблему. На яго погляд, гэтыя людзі прыбываюць у нашу краіну цалкам самастойна з надзеяй трапіць у Еўрасаюз. Нейкая дадатковай нагрузкі з іх боку на беларускі бюджэт міністр фінансаў не бачыць. «Яны прыбываюць у нашу краіну за асабістыя грошы, спрыяюць больш поўнаму запаўненню беларускіх гасцініц і, магчыма, павелічэнню паступленняў валюты ў краіну».

Сяргей КУРКАЧ.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Магазін на поўначы Францыі перастаў прадаваць каноэ, каб мігранты не спрабавалі пераплыць у іх Ла-Манш

Рытэйлер спартыўных тавараў Decathlon часова прыпыніў продаж каноэ ў паўночных рэгіёнах Францыі, каб нелегальныя мігранты не маглі выкарыстоўваць іх для перасячэння праліва Ла-Манш, перадае BBC.

Кампанія паведаміла: продажы каноэ ў Кале і Гранд-Сінце прыпыняюцца на нявызначаны тэрмін. Пры гэтым каноэ па-ранейшаму будуць прадавацца ў магазінах у іншых рэгіёнах краіны, а таксама праз інтэрнэт.

Рэтэйлер прыняў такое рашэнне пасля таго, як Міністэрства ўнутраных спраў Вялікабрытаніі заявіла аб рэкорднай колькасці мігрантаў, якія прыбылі 11 лістапада ў краіну на невялікіх лодках. Іх было 1185 чалавек. Прадстаўнік Decathlon адзначыў: купіць каноэ на поўначы Францыі стане немагчыма, бо «жыцці людзей, якія спадзяюцца дабрацца да берагоў Вялікабрытаніі, могуць быць у небяспецы».

Зараз паміж Парыжам і Лонданам захоўваецца напружанасць па пытанні перасячэння мігрантамі Ла-Манша. Раней з'явіліся паведамленні, што французская паліцыя дэманцiравала вялікі лагер для мігрантаў недалёка ад Дзюнкерка. Гэтыя людзі планавалі дабрацца да Вялікабрытаніі.

Талібы правялі спецаперацыю супраць ІД у Кабуле

Узброеныя сутыкненні паміж талібамі і баявікамі «Ісламскай дзяржавы» прайшлі ў паўночнай частцы афганскай сталіцы Кабула. Пра гэта паведамляе РІА «Навіны» са слоў прадстаўніка паліцыі.

Сілы бяспекі «Талібана» ўзялі пад поўны кантроль гэты раён сталіцы, знішчыўшы траіх баевікоў. Гэтая арганізацыя супрацьстаяла талібам у Афганістане з 1996 да 2001 года. Чаму баі прайшлі там, невядома.

Вучоныя высветлілі, што нашэнне масак зніжае захваральнасць на COVID на 53 %

Нашэнне масак спрыяе значнаму зніжэнню захваральнасці на каранавірус COVID-19, паведаміла ў чацвер газета The Guardian са спасылкай на міжнароднае даследаванне.

Навукоўцы з шэрагу краін, у тым ліку Вялікабрытаніі, прыйшлі да высновы, што нашэнне масак з'яўляецца самай эфектыўнай мерай у барацьбе з распаўсюджваннем COVID-19. Яны таксама адзначылі ў даследаванні, што эфектыўным з'яўляецца выкананне дыстанцыі і мыццё рук.

Згодна з вынікамі, атрыманымі ад больш як 30 асобных даследаванняў, нашэнне масак зніжае захваральнасць на 53 працэнты, захаванне дыстанцыі — на 25 працэнтаў.

Вучоныя адзначаюць, што мыццё рук таксама лічыцца эфектыўнай мерай і памяншае захваральнасць на больш як 50 %, адзначае выданне. «Некалькі сацыяльных мер, у тым ліку мыццё рук, нашэнне масак і захаванне дыстанцыі, звязана з істотным зніжэннем захваральнасці на каранавірус», — адзначылі даследчыкі.

Пры гэтым спецыялісты з Універсітэта Манаша ў аўстралійскім штаце Вікторыя і Эдынбургскага ўніверсітэта падкрэслілі, што такія меры, як лакдаўн і закрыццё меж, школ і офісаў, трэба даследаваць асобна, каб ацаніць патэнцыйнае негатыўнае ўздзеянне падобных абмежаванняў на насельніцтва.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Государственное предприятие «МГЦН» **21 декабря 2021** года проводит **открытый аукцион по продаже права заключения договора аренды** части изолированного помещения, находящегося в собственности ООО «КэпиталБилдинг» (далее – имущество)

Местонахождение имущества	Площадь (кв. м)	Размер арендной платы	Начальная цена права заключения договора аренды имущества/ сумма задатка (руб.)	Целевое использование имущества	Наименование имущества, его характеристика, необходимые условия аренды и иные сведения
Арендодатель – ООО «КэпиталБилдинг», тел. +375 (29) 606 09 26					
г. Минск, ул. Судмалиса, 1Б	5,0	3 евро за 1 кв.м без НДС (*)	50,00	Под осуществление розничной торговли, объект общественного питания	Часть нежилого изолированного помещения. Срок аренды – 1 год. (**)

** Арендная плата подлежит уплате в белорусских рублях по курсу Национального банка Республики Беларусь на день совершения платежа.*
*** Техническое описание помещения: к помещению проведено электроснабжение, возможность монтажа системы вентиляции – монтаж и подключение к коммуникациям производится за счет арендатора без последующей компенсации стоимости затрат. Техническое улучшение помещения, а также текущий ремонт осуществляются за счет арендатора и последующей компенсации не подлежат*

Организатор аукциона – государственное предприятие «МГЦН», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 10, тел. +375 (17) 360 42 22.

Аукцион состоится **21 декабря 2021 г. в 15.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 7 (зал аукционов).

Прием документов и консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются **с 22 ноября 2021 г. по 15 декабря 2021 г. включительно** в рабочие дни с 9.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.30) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6. Заявления на участие в аукционе, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Ответственность за достоверность сведений, указанных в документах, представленных для участия в аукционе, несут лица, их подавшие.

Порядок оформления участия в аукционе:

к участию в аукционе допускаются юридические или физические лица, в том числе индивидуальные предприниматели, внесшие в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, на указанный текущий (расчетный) банковский счет сумму задатка, подавшие организатору аукциона в указанный в извещении срок заявления на участие в торгах с приложением всех необходимых документов, заключившие с организатором аукциона соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (далее – соглашение), зарегистрированные в журнале регистрации заявлений. Лицу, допущенному к участию в аукционе, организатор аукциона выдает билет участника аукциона, в котором указывается порядковый номер, под которым данное лицо зарегистрировано.

Для участия в аукционе лица, желающие участвовать в нем, подают организатору заявления на участие в аукционе с приложением следующих документов:

• документ, подтверждающий внесение суммы задатка на расчетный счет BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк» г. Минск, БИК BLBBBY2X, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583, назначение платежа – задаток для участия в аукционе от 21.12.2021. Сумма задатка соответствует начальной цене предмета торгов;

• копии документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования – для юридических лиц или индивидуальных предпринимателей Республики Беларусь;

• копии учредительных документов и выписки из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения – для иностранных юридических лиц.

При подаче заявления на участие в аукционе:

физическое лицо, в том числе индивидуальный предприниматель, желающие участвовать в аукционе, предъявляют документ, удостоверяющий личность;

представитель лица, желающего участвовать в аукционе, предъявляет: документ, удостоверяющий личность; доверенность, за исключением случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель; документ, подтверждающий полномочия руководителя юридического лица (приказ о назначении на должность руководителя, или заверенную выписку из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юридического лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или соответствующий гражданско-правовой договор, или иные документы, подтверждающие полномочия), если юридическое лицо представляет его руководитель.

Документы, составленные на иностранном языке, должны представляться (предъявляться) с переводом на белорусский или русский язык (верность перевода или подлинность подписи переводчика должны быть засвидетельствованы нотариально).

Порядок определения победителя аукциона:

аукцион проводится в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже права заключения договоров аренды недвижимого имущества, находящегося в частной собственности, утвержденным организатором аукциона (далее – Порядок).

Перед началом аукциона организатор аукциона проводит заключительную регистрацию лиц, допущенных к участию в аукционе. Заключительная регистрация представляет собой замену организатором аукциона билетов участников аукциона на аукционные номера, под которыми участники аукциона будут участвовать в аукционе. После проведения аукциона участники аукциона обязаны вернуть эти номера организатору аукциона.

Аукцион проводит аукционист, определяемый организатором аукциона. Аукцион начинается с оглашения аукционистом правил проведения аукциона, шага аукциона. Шаг аукциона устанавливается аукционистом в пределах от 5 до 15 процентов от предыдущей цены предмета аукциона, названной аукционистом.

Аукцион начинается с объявления аукционистом наименования, места нахождения, краткой характеристики недвижимого имущества, право заключения договора аренды которого выставляется на аукцион, начальной цены, срока, на который будет заключен договор аренды. После оглашения данной информации аукционист в соответствии с шагом аукциона объявляет первую цену предмета аукциона. Не допускается продажа предмета аукциона по начальной цене. Аукцион продолжается до тех пор, пока по новой объявленной аукционистом цене аукционный номер поднимет только один участник аукциона. Аукционист трижды называет цену, по которой продан предмет аукциона, и объявляет о продаже данного предмета аукциона, а также сообщает номер участника аукциона, выигравшего аукцион (далее – победитель аукциона).

Если заявление на участие в аукционе подано только одним участником, либо для участия в нем явился только один участник, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов, а такой участник признается лицом, приравненным к победителю аукциона.

Обязанности победителя аукциона (лица, приравненного к победителю аукциона):

подписать протокол о результатах проведения аукциона в день его проведения;

в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона в установленном порядке перечислить на текущий (расчетный) счет арендодателя сумму, за которую продан предмет аукциона, за вычетом внесенной им суммы задатка;

в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение (информация о затратах доводится до сведения участников перед началом аукциона);

в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона заключить с арендодателем договор аренды имущества.

Размер штрафа, уплачиваемого участником аукциона и (или) его победителем (приравненным к нему лицом) в случаях, предусмотренных законодательством и соглашением, составляет 99 (девяносто девять) базовых величин на дату проведения аукциона.

Дополнительная информация:

возможность осмотра имущества, право заключения договора аренды которого выставлено на аукцион, обеспечивает арендодатель;

организатор аукциона настоятельно рекомендует лицам, желающим участвовать в аукционе, уточнить у арендодателя возможность использования объекта под планируемые виды деятельности (в том числе с учетом требований санитарных и противопожарных норм), размеры арендной платы и коммунальных платежей, а также ознакомиться с проектом договора аренды имущества;

организатор аукциона в течение 5 рабочих дней со дня его проведения возвращает участникам аукциона, за исключением случаев, предусмотренных Порядком, внесенные ими задатки (сумма задатка, внесенного победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона), засчитывается при оплате им стоимости предмета аукциона);

договор аренды по результатам аукциона может быть заключен исключительно с участником аукциона, ставшим победителем (приравненным к нему лицом), заключение договора аренды, целевое назначение которого предполагает осуществление предпринимательской деятельности, с субъектом, который в силу законодательства не может осуществлять названную деятельность, не допускается.

Телефоны для справок: отдел аукционов – +375 (17) 360 42 22, бухгалтерия – +375 (17) 366 36 58.

Извещение о проведении аукциона размещено на сайтах: организатора аукциона – www.mgcn.by (раздел «Недвижимость в аренду»); Минского городского исполнительного комитета – www.minsk.gov.by (раздел «ПРОДАЖА/АРЕНДА»).

ООО «Деловая оценка» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Табаквинторг» (продавец) извещает о проведении 30 ноября 2021 года открытого повторного аукциона по продаже имущества в 11.00 по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2

ЛОТ № 1: изолированное помещение с инвентарным номером 300/D-678 площадью 960,7 кв. м, назначение – торговое помещение, наименование – торговое помещение
Адрес: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Привокзальная, 2 А-109
Информация о земельном участке: кадастровый номер 340100000001000921, площадь 0,1871 га (доля в праве 37/250); назначение – земельный участок для эксплуатации и обслуживания многоквартирных жилых домов, встроенных изолированных помещений, не относящихся к жилищному фонду
Начальная цена продажи с учетом НДС: 1 971 900,00 бел. рублей
Задаток (3 %) с учетом НДС: 59 157,00 бел. рублей
Дополнительные условия: заключены договора аренды: РУП «Фармация» действует до 24.09.2024; ОАО «Белинвест Банк» – до 01.10.2022; ООО «Городская сеть терминалов» – до 11.11.2021; ООО «Тимоша бел» – до 11.04.2022; ИП Мишанина М.Н. – до 31.12.2021

Продавец: ОАО «Табаквинторг», г. Гомель, ул. Могилевская, 1а. Контактные телефоны: +375 29 334-04-60; +375 44 599-02-90.

Шаг аукциона – 5 % от предыдущей названной аукционистом цены продажи предмета аукциона.

Для участия в аукционе необходимо: 1. Оплатить задаток на расчетный счет Продавца ОАО «Табаквинторг»: **р/с BY44PJCB30124055581000000933 ОАО «Приорбанк» (г. Гомель, ул. Красноармейская, 3а), БИК PJCBBY2X, УНП 400078357**

2. Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов по адресу: г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2, в рабочие дни с 10.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 от даты опубликования настоящего извещения. **Прием заявлений заканчивается 29.11.2021 в 16.00.**

Для участия в аукционе представляются: документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юр. лицом или индивидуальным предпринимателем (далее ИП) Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юр. лица или ИП; иностранным юр. лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; иностранным ИП – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юр. лица Республики Беларусь – доверенность; представителем гражданина или ИП Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юр. лица, иностранного физ. лица или ИП – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юр. лица – также документ, подтверждающий его полномочия.

Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 (три) дня до его проведения. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %**. Победителем торгов будет признан участник, предложивший более высокую цену. Лицо, являющееся победителем торгов, обязано: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **10 (десяти)** календарных дней с момента подписания протокола; расчеты производить в следующем порядке: четырьмя равными долями каждые **10 (десять)** календарных дней со дня заключения договора купли-продажи; возместить затраты на организацию и проведение аукциона и оплатить вознаграждение организатору торгов в размере 1,0 % в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет окончательной стоимости предмета оценки. Проводится аукцион в соответствии с Положением Общества с ограниченной ответственностью «Деловая оценка» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части). Дополнительная информация **по контактным телефонам организатора аукциона: +375 (232) 34-62-36, +375 (44) 750-40-03, +375 (29) 303-30-62 и на сайте www.deloocenka.by**

Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

информирует о проведении 21/12/2021 открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Рассвет им. К.П. Орловского»

Лот № 1: самолет АН-2, тип – сельскохозяйственный, 1977 г. в, з/н Г17804, б/н EW-62619, з/н двигателя К1606707, тип двигателя АШ-62ИР. ***Начальная цена продажи: 28 368,00 бел. руб. с учетом НДС.***

Лот № 2: самолет АН-2, тип – сельскохозяйственный, 1984 г. в., з/н 1Г20843, б/н EW-230 CD. ***Начальная цена продажи: 13 824,00 бел. руб. с учетом НДС.***

Лот № 3: двигатель АШ-62ИР, год ввода в эксплуатацию – май 1988, з/н – К1647821. ***Начальная цена продажи: 6 768,00 бел. руб. с учетом НДС.***

Лот № 4: двигатель АШ-62ИР, год выпуска – февраль 1986, заводской номер – К16416109. ***Начальная цена продажи: 4 752,00 бел. руб. с учетом НДС.***

Аукцион состоится 21 декабря 2021 года в 12.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352.

Извещение о проведении аукциона размещено на сайте Организатора аукциона ino.by. **Организатор аукциона:** Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182, г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 351, 352, +375222-72-41-14, +37529-624-26-25, Mogilev@ino.by

БЕЛАРУСБАНК

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА по продаже капитального строения

Организатор торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества – Гродненское областное управление № 400 ОАО «АСБ Беларусбанк»

Наименование объекта продажи	Капитальное строение общей площадью 332,9 кв. м с инвентарным номером 450/С-26030, расположенное по адресу: Гродненская область, г. Слоним, ул. Ф. Скорины, 25а. Земельный участок с кадастровым номером 425450100001007317 площадью 0,0582 га предоставлен ОАО «АСБ Беларусбанк» в постоянное пользование. Целевое назначение земельного участка – для обслуживания здания
Начальная цена продажи	392 828,48 (триста девяносто две тысячи восемьсот двадцать восемь рублей 48 копеек), в том числе НДС по ставке 20 % – 65 471,41 (шестьдесят пять тысяч четыреста семьдесят один рубль 41 копейка)
Сумма задатка	39 282,85 (тридцать девять тысяч двести восемьдесят два рубля 85 копеек).
Открытый аукцион состоится	**11.01.2022 в 10.00 по адресу: г. Гродно, ул. Новооктябрьская, 5, актовый зал (помещение на третьем этаже)**
Заявления и документы на участие принимаются	В рабочие дни с 9.00 до 17.00, в пятницу – до 15.45, до 15.00 06.01.2022 включительно по адресу: г. Гродно, ул. Новооктябрьская, 5, кабинет 307
Продавец	ОАО «АСБ Беларусбанк». Договор купли-продажи заключается и регистрируется в РУП «Гродненское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру»
Дополнительные условия	Объект недвижимости имеет следующие обременения – капитальное строение с инвентарным номером 450/С-26030 в полном объеме сдано в аренду: Продаже подлежат прочие объекты основных средств (пожарная сигнализация, аппарат отопительный газовый с водяным контуром) общей стоимостью 849,96 (восемьсот сорок девять рублей 96 копеек), с учетом НДС по ставке 20 %. Приобретаются победителем аукциона либо единственным участником аукциона на основании отдельно заключенного договора купли-продажи
Контактные данные	По вопросам, связанным с организацией осмотра объектов продажи и проведения аукциона, обращаться по телефонам: +375(152) 737326, +375(1562) 66900, +375(44) 1599001 (A1), +375 (44) 5455954 (A1)

Для участия в открытом аукционе представляется заявление, к которому прилагается документ с отметкой банка, подтверждающий внесение суммы задатка до 06.01.2022 на счет № BY69AKBB66708597000020000000, открытый в ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY2X, УНП 100325912, назначение платежа – задаток для участия в аукционе.

К заявлению также прилагаются:

юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования;

иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык;

иностранным индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык;

представителем юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель);

представителем гражданина или индивидуального предпринимателя Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность;

представителем иностранного юридического лица, иностранного физического лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия (приказ о назначении на должность руководителя, или заверенная выписка из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юридического лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или соответствующий гражданско-правовой договор, или иные документы в соответствии с законодательством).

При подаче заявления организатором открытого аукциона с участниками заключается соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Открытый аукцион проводится путем пошагового увеличения цены. Шаг аукциона – 5 % от предыдущей названной цены. Аукцион проводится при наличии не менее двух допущенных к участию в нем участников. Победителем открытого аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену.

Участнику, не выигравшему торги, задаток возвращается в течение 5 (пяти) рабочих дней со дня проведения аукциона. Победителю аукциона задаток не возвращается, а учитывается при окончательных расчетах по приобретению предмета аукциона.

Если заявка на участие в аукционе подана только одним участником, аукцион признается несостоявшимся. В данном случае предмет аукциона продается участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Победитель аукциона возмещает затраты на организацию и проведение аукциона в течение 5(пяти) рабочих дней со дня проведения аукциона.

Договор купли-продажи по результатам проведения аукциона должен быть подписан не позднее 30 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов.

Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 дня до наступления даты его проведения.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

19 лістапада 2021 г. № 45 (630)

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

МАЛАЯ РАДЗІМА

Фота Дафі ЗВЕРС.

СІНЕРГЕТЫЧНЫ ЭФЕКТ ПА-СЕМУКАЦКУ

У аграгарадку Магілёўскага раёна чарговы раз прадэманстравалі, як матэрыялізуюцца нават самыя смелыя ідэі

За апошнія чатыры гады пра аграгарадок Семукачы мы пісалі неаднойчы. Тут то мемарыялы будуюць, то крынічкі вяртаюць да жыцця, то алеі саджаюць, то саламяныя скульптуры ўстанаўліваюць. Адным словам, крэатыўшчыкі, якіх пашукаць. Каштоўна, што гэтыя невялікія праекты аб'ядноўваюць тутэйшых жыхароў і натхняюць іх на новыя справы. У апошнюю пятніцу кастрычніка тут, напрыклад, з'явілася бібліятэка пад адкрытым небам, а днямі адкрылася жывая лабараторыя — своеасаблівы кантактны заапарк. Праўда, прызначэнне яго — не столькі забаўляць, колькі выхоўваць падлеткаў. Як, дарэчы, і ў выпадку з бібліятэкай.

Гісторыя ў метале

Двухметровы глобус, на версе якога напісана «Зямля мая, зямля бацькоў святая», і восем металічных фаліянтаў памерам 60х75 сантыметраў на каваных падстаўках з'явіліся на плошчы каля Семукацкага комплексу дзіцячы сад — школа. На старонках кніг-веліканаў адліты гісторыі тутэйшых вёсак. Яшчэ тры гады таму іх было 31, а зараз ужо 29. Насельніцтва старэе, шматдзетныя выязджаюць будаваць жыллё ў горад. Маюць права. Канешне, калі б усе былі такімі патрыётамі, як **старшыня Семукацкага сельскага Савета Тамара УКРУЖСКАЯ,** напэўна, агні вялікага горада так моцна не вабілі б да сябе людзей, не адрывалі б ад зямлі. На гэты раз дэпутатка вырашыла сама вывучыць гісторыю роднага сельсавета, а заадно далучыць да яе і ўсіх мясцовых, пачынаючы ад школьнікаў і заканчваючы жыхарамі залатога ўзросту.

— Такая ідэя ўзнікла летась, — расказвае няўрымслівая Тамара Укружская. — Перад гэтым мы тры гады — у адпаведнасці з трылогіяй Года малой радзімы — працавалі над праектам «Вяртанне да вытокаў». Рабілі алеі памяці ў гонар нашых землякоў, высаджвалі дрэвы і ўзводзілі міні-манументы на тэрыторыі сельсаветаў, прывозілі ў парадак могілкі — гэта ж таксама наша памяць. А сёлета, у Год народнага адзінства, плённа працавалі над зборам матэрыялаў па гісторыі населеных пунктаў. Яшчэ не кожны жыхар сельсавета з ходу агучыць усе іх назвы, ну а пра іх паходжанне нават дасведчаныя не заўсёды ведалі.

стар. 18

У ЦЭНТРЫ ЎВАГІ

«Чысціня слова — чысціня душы»

У Савеце Рэспублікі прайшоў тэматычны круглы стол

Што зрабіць, каб дрэнныя словы не гучалі ў грамадскіх месцах? Як перабіць гэты «трэнд» у маладзёжным асяродку? Якія крокі неабходна зрабіць, каб чысціня мовы стала звычкай? Адказ на гэтыя пытанні шукалі сенатары, святары, навукоўцы, кіраўнікі міністэрстваў, грамадскіх аб'яднанняў і прадстаўнікі Маладзёжнага парламента.

Спікер верхняй палаты парламента Наталля КАЧАНАВА звярнула ўвагу на тое, што на першы погляд можа падацца, што праблема не так востра стаіць перад грамадствам, але пры больш шчыльным яе вывучэнні, відаць: яна ёсць.

— Як людзі размаўляюць паміж сабой, ці ўмеюць па-добраму ставіцца адзін да аднаго, выказваючы гэта словамі, — важна, — пераканана Старшыня Савета Рэспублікі. — Гэта характарызуе культуру паводзін, узровень развіцця нашага грамадства.

Спікер вярнулася да падзей мінулага года, якія паказалі, што ў шэрагу момантаў страчвалася культура паводзін, чалавечыя нормы, нормы зносін.

— Мы павінны даваць ацэнку гэтым негатыўным момантам і шчыльна праводзіць работу па чысціні слова, усіх нераўнадушных людзей, якія перажываюць за развіццё сваёй краіны, народа і за тое, каб мір і дабрыня былі з намі, — падкрэсліла Наталля Качанава.

Больш падрабязна аб меркаваннях, агучаных падчас круглага стала, чытайце ў нумары «Звязды» за аўторак, 23 лістапада.

Віктар ЛІСКОВІЧ:

«Мы зробім усё неабходнае, каб бежанцы максімальна захавалі здароўе»

Стацыянарны медыцынскі пункт, дзе можна прышчапіцца ад COVID-19, запрацаваў у імправізаваным лагеры бежанцаў на беларуска-польскай граніцы.

Як расказаў **старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Віктар ЛІСКОВІЧ** у гутарцы з журналістамі, органы выканаўчай улады, зацікаўленыя структуры Гродзенскага аблвыканкама адказна падыходзяць да ўсіх пытанняў, якія ўзнікаюць у лагеры бежанцаў, і ў якасці пацвярджэння прыводзіць работу медпункта.

— Ён не толькі для вакцынацыі (ад COVID-19. — **Аўт.**), але і для аказання медыцынскай дапамогі, правядзення медыцынскай сарціроўкі магчымых хворых, пацыентаў і далейшага вызначэння іх месца (пакідаць іх тут ці адпраўляць на стацыянарнае лячэнне ў Гродна), — патлумачыў сенатар.

Паводле яго слоў, толькі за мінулыя суткі (17 лістапада. — **Аўт.**) па медыцынскую дапамогу звярнуліся 37 чалавек, некалькі з іх былі шпіталізаваны, астатнія атрымалі медыцынскую кансультацыю.

— Па просьбе бежанцаў мы падрыхтаваліся да вакцынацыі, разгарнулі ўсё неабходнае і будзем па іх жаданні прышчапляць кітайскай вакцынай, — расказаў Віктар Лісковіч і патлумачыў, што актуальнай задачай з'яўляецца супрацьдзеянне распаўсюджванню інфекцыі, у тым ліку каранавірусная, каб не дапусціць масавай захваральнасці сярод бежанцаў.

Ён адзначыў, што, па неафіцыйнай інфармацыі, некаторыя з бежанцаў ужо прышчэплены, і гэта таксама дапамагае рабоце беларускіх медыкаў.

— Медыцына Гродзеншчыны, беларуская медыцына абсалютна падрыхтаваны і гатовы ў поўным аб'ёме аказаць неабходную дапамогу любой складанасці, якая тут можа ўзнікнуць. І мы зробім усё неабходнае, каб бежанцы максімальна захавалі сваё здароўе, — запэўніў сенатар.

Вольга АНУФРЫЕВА.

«НАША МОЦ — У АДЗІНСТВЕ І КАНСАЛІДАЦЫІ»

Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА сустрэлася з прадстаўнікамі Маладзёжнага парламента

Падчас гутаркі з маладымі людзьмі абмяркоўвалася бягучая сітуацыя ў краіне, задачы, якія стаяць перад маладымі парламентарыямі, і змены ў структуры гэтай арганізацыі.

Актыўна і ініцыятыўна

Нагадаем, што такія сустрэчы праходзяць рэгулярна. На іх маладыя людзі, якія прадстаўляюць усе рэгіёны нашай краіны, маюць магчымасць з першых вуснаў пачуць важную інфармацыю з актуальнага парадку дня. Гэтая сустрэча не стала выключэннем. Распачынаючы яе, спікер верхняй палаты парламента звярнула ўвагу на сітуацыю, якая складваецца на беларуска-польскай граніцы і разгортваецца вакол нашай краіны:

— Фэйкі, хлусня запаланілі ўсё, што толькі можна, — адзначыла яна і акцэнтавала ўвагу моладзі на тым, што трэба праяўляць больш ініцыятыўнасці ў зносінах з аднагодкамі і данясенні да маладзёжнай аўдыторыі актуальнай, праўдзівай і цалкам аб'ектыўнай інфармацыі.

— Вы як ніколі павінны быць актыўнымі, сустракацца з людзьмі, даносіць праўду, асабліва ў маладзёжнай аўдыторыі, бо, як кажуць, моладзь не глядзіць тэлебачанне і не чытае газеты, і толькі можна меркаваць, якую інфармацыю яна атрымлівае з інтэрнэту, — звярнула ўвагу спікер Савета Рэспублікі.

Яна пераканана: калі інфармацыю можна данесці да людзей непасрэдна ў гутарцы — трэба карыстацца такой магчымасцю.

— Неабходна прыцягваць моладзь у вашы праекты для таго, каб створаны вамі рух («Рух наперад! — **Аўт.**) стаў прыкладам для іншых, — нацэльвае моладзь Наталля Качанава. — Вас бачаць і ведаюць, таму вы павінны працаваць больш эфектыўна і згуртавана.

Звёны аднаго ланцуга

Спікер яшчэ раз звярнула ўвагу прадстаўнікоў Маладзёжнага парламента на няпростую сітуацыю, якая складваецца вакол Беларусі:

— Сітуацыя, што была ў 2020 годзе і цяпер, — гэта звёны аднаго ланцуга, — пераканана яна. — Не атрымалася тады, потым былі розныя правакацыі, якія перараслі ў цяперашнюю сітуацыю. Заўтра будзе іншая. Таму наша моц — у адзінстве і кансалідацыі.

Старшыня Савета Рэспублікі звярнула ўвагу маладых людзей, што дзяржава, якая стаіць на абароне людзей, кажа абсалютную праўду, імкнецца жыць па ўласных прынцыпах і традыцыях, якія склаліся на яе тэрыторыі, задавальняе далёка не ўсіх. Яна пераканана, што аб гэтым трэба часцей казаць у маладзёжных аўдыторыях, таму маладым парламентарыям у гэтай справе — зялёнае святло.

Расказала Наталля Качанава юным калегам і аб рабоце гуманітарнай місіі, якую курыруе па даручэнні кіраўніка дзяржавы. У прыватнасці, беларускі бок ужо перадаў 40 тон гуманітарнага грузу, яшчэ 10 тон чакаюць адпраўкі. Усё, што неабходна для забеспячэння жыццядзейнасці людзей, якія захраслі на беларуска-польскай граніцы, беларускі бок выконвае і працягне гэта рабіць да той пары, пакуль будзе ў гэтым патрэба. І гэта датычыцца забеспячэння ежай, вадой, медыцынскай дапамогай і гэтак далей. Толькі спачатку месяца па медыцынскую дапамогу звярнулася каля 60 бежанцаў. Менавіта гэтую інфармацыю, а не правакацыйныя фэйкі, якія з'яўляюцца ў інтэрнэт-прасторы, трэба даносіць да маладзёжнай аўдыторыі, пераканана спікер верхняй палаты парламента.

Фота БелТА.

— Нельга жыць адным днём — трэба штодзённа, штогадзінна думаць аб тым, што я яшчэ павінен зрабіць для таго, каб у краіне стала лепш і голас праўды і розуму быў пачуты, — пераканана Наталля Качанава.

Навучанне і ратацыя

У сваю чаргу **старшыня Маладзёжнага савета Ягор МАКАРЭВІЧ** паведаміў, што маладыя парламентарыі ў рамках праекта «Беларусь будучыні» працягваюць сустрэчы з навучэнцамі і студэнтамі ва ўстановах адукацыі. Адна з актуальных тэм цяперашніх сустрэч — крызіс на беларуска-польскай граніцы, выкліканы наплывам бежанцаў з краін Блізкага Усходу. У студэнцкіх калектывах арганізаваны сустрэчы, дзе тлумачыцца сутнасць праблемы.

Што датычыцца дзейнасці маладзёжнага грамадскага аб'яднання «Рух наперад», было праведзена абнаўленне кіраўніцкага складу гэтай моладзевай арганізацыі, расказаў Ягор Макарэвіч.

Сёлета ў верасні быў запушчаны адукацыйны модуль у рамках лідарскай платформы «Каманда будучыні». Старт навучання маладых лідараў адбыўся 9 кастрычніка ў прэс-цэнтры Савета Рэспублікі, дзе ў фармаце дэбатаў яго ўдзельнікі абмеркавалі пытанні канстытуцыйнай рэформы, механізму фарміравання Усебеларускага народнага сходу, смяротнага пакарання як вышэйшай меры пакарання, а таксама бяспекі моладзі ў сацыяльных сетках.

Трэба дадаць, што лідарская платформа «Каманда будучыні» — праект пошуку, папулярызацыі і навучанні маладых лідараў Беларусі тэарэтычным і практычным навыкам у сферы лідарства і дзяржаўнага кіравання.

У рамках дзейнасці тэматычнай платформы прайшлі чатыры навучальныя семінары. Другі набор плануецца правесці ў студзені 2022-га.

Не абмінуў старшыня Маладзёжнага савета і тэму ратацыі кадраў.

— Арганізавана работа па стварэнні адзінай сістэмы органаў маладзёжнага парламентарызму і ўніфікацыі падыходаў да іх дзейнасці, — патлумачыў ён сутнасць падыходаў.

Паводле яго слоў, у склад Маладзёжнага парламента замест прадстаўнікоў абласцей, якія раней выбывалі, дэлегавана 25 чалавек, большасць навучаецца ва ўстановах вышэйшай адукацыі, ёсць прадстаўнікі працоўнай моладзі, адзін курсант інстытута пагранічнай службы.

— У нашым складзе з'явіцца прадстаўнікі такіх прадпрыемстваў і арганізацый, як Беларускі металургічны завод, БЕЛАЗ, цэнтра «Нацыянальная школа прыгажосці» і іншых, — патлумачыў Ягор Макарэвіч.

Ад TikTok да аналітыкі

Інфармацыйная прастора таксама актыўна асвойваецца маладымі парламентарыямі. Адным з цікавых праектаў па асвятленні дзейнасці членаў Маладзёжнага парламента з'яўляецца супрацоўніцтва з патрыятычным блогерам Сцюшай Тайм, які транслюецца ў ранішнім блоку на тэлеканале «РТР-Беларусь», а таксама размяшчаецца ў сацыяльнай сетцы TikTok. На дадзены момант ужо выйшла ў эфір 14 выпускаў праекта.

Са жніўня на тэлеканале «СТВ» транслюецца аўтарская інфармацыйна-аналітычная рубрыка «Сенат», у якой падрабязна асвятляецца дзейнасць Савета Рэспублікі, яго членаў, а таксама Маладзёжнага парламента.

— На сёння ў эфір выйшла сем выпускаў. У планах — пашырыць рубрыку па хронаметражы, запусціць рэгіянальныя ўключэнні членаў Савета Рэспублікі і дэпутатаў мясцовых Саветаў, а таксама размясціць яе ў эфірнай сетцы вяшчання рэгіянальных тэлеканалаў, — патлумачыў **аўтар і вядучы праграмы Пётр АРЛОЎ, старшыня камісіі Маладзёжнага парламента па міжнародным і рэгіянальным супрацоўніцтве.**

Аднак, лічыць моладзь, гэта толькі пачатак і спыняцца на дасягнутым не трэба. Напарадзе — новыя выклікі і новыя дасягненні.

Вольга АНУФРЫЕВА.

МЕРКАВАННЕ

Вытокі праблем бежанцаў — у варварскай палітыцы калектыўнага Захаду

Старшыня Маладзёжнага савета (парламента) пры Нацыянальным сходзе Беларусі Ягор МАКАРЭВІЧ падзяліўся з журналістамі сваім стаўленнем да крызісу на беларуска-польскай граніцы і даў ацэнку дзеянням калектыўнага Захаду:

— Мы бачым, як у інфармацыйным полі гэтую тэму імкнуцца паднесці, асабліва апаненты беларускай улады. Мы лічым, што тут не павінна быць ніякіх інсінуацый. Гэта вялікая праблема, у першую чаргу для бежанцаў, для тых, хто бяжыць ад вайны. Таму члены Маладзёжнага парламента сустракаюцца ў студэнцкіх калектывах. Літаральна на мінулым тыдні прайшло некалькі такіх сустрэч, каб маладыя людзі сапраўды разумелі вытокі гэтай праблемы. А вытокі тут адны — варварская палітыка калектыўнага Захаду, якая накіравана на разбурэнне суверэнных дзяржаў. І сёння гэтыя людзі бягуць ад вайны і гора, — пераканаў старшыня Маладзёжнага савета.

Ягор Макарэвіч звяртае ўвагу на тое, што маладыя людзі ў Беларусі сёння маюць не толькі цяперашнія дасягненні суверэннай дзяржавы, але і выразна бачаць будучыню ў сваёй краіне, асацыіруюць сябе са сваёй краінай.

— Людзей, якія знаходзяцца на беларуска-польскай граніцы, на жаль, пазбавілі цяперашняга, а падобнымі дзеяннямі іх спрабуюць пазбавіць і будучыні, — падкрэслівае суразмоўнік і акцэнтуе ўвагу на тым, як краіны калектыўнага Захаду праблему бежанцаў, якія зараз пакутуюць на беларуска-польскай мяжы, спрабуюць усялякім чынам перакінуць на плечы Беларусі. — Але яна павінна вырашацца тымі краінамі, якія сталі лакаматывам у гэтым працэсе.

Малады парламентарый выказаў надзею на як мага хутчэйшае вырашэнне праблемы бежанцаў на беларуска-польскай граніцы.

— Бо немагчыма ў цывілізаваным свеце дапускаць такое стаўленне да людзей, у першую чаргу да дзяцей і жанчын, — падкрэсліў ён.

Акрамя таго, ён згадаў падзеі мінулага года, калі беларускае грамадства спрабавалі навучыць «дэмакратыі», «свабодзе слова», «правам чалавека», нягледзячы на тое, што наша краіна абараняла свае дзяржаўныя інтарэсы, канстытуцыйны лад і выбар, зроблены народам.

— А сёння мы бачым зверскае стаўленне да людзей, якія з пункту гледжання ўсіх міжнародных нормаў з'яўляюцца бежанцамі, шукаюць прытулку і просяць іх прыняць у тых краінах, якія ў свой час іх да сябе запрашалі, — рэзюмаваў Ягор Макарэвіч.

Вольга АНУФРЫЕВА.

Сваё кіно

БАРАЦЬБА ПА ЎЛАСНЫХ МАТЫВАХ

У панядзелак, 22 лістапада, спаўняецца 75 гадоў з дня нараджэння акцёра, народнага артыста Беларусі Валерыя Філатава. Напярэдадні гэтай даты ў эфіры сацыякультурнага канала па добрай традыцыі падрыхтавалі фільм з удзелам творцы.

Так, 20 і 21 лістапада на «Беларусь 3» пакажуць і мастацкую кінастужку «Мама, я жывы», якая ўбачыла свет на «Беларусьфільме» ў 1985 годзе. Гэтая рэжысёрская работа Ігара Дабралюбава распавядае гісторыю ваенных часоў. Дзеянне адбываецца восенню 1943 года ў адным з партызанскіх лагераў у беларускіх балотах. У «лясную школу» сюды трапляе хлопчык Пеця, які прапусціў два гады навучання і таму пачынае вучыцца спачатку. І вось у хуткім часе камандаванне вырашае настаўніцу з вучнямі адправіць на Вялікую зямлю, аднак на месцы прыбыцця самалёта размясціўся атрад фашыстаў. Усё ж такі пад прыкрыццём партызан дзеці і настаўніца змаглі схавацца ў доме на балотах, але пераследнікі спальваюць усе сшыткі і падручнікі, а іх пакідаюць жывымі, бо спадзяюцца, што тыя памруць з голаду. Толькі вось праціўнікі не ведаюць, што сярод дзяцей ёсць хлопчык, у якога свае матывы і план, як перашкодзіць карнікам... Пеця Дым мае вопыт разведчыка і выкапаныя ў полі міны, а яшчэ — намер адпомсціць за маму і здаць экзамен за пяты клас, а значыць, будзе дзейнічаць...

Валерыя Філатава ў гэтым фільме мы ўбачым у ролі камандзіра партызанскага атрада, а ролю Пеці Дыма ўвасобіў на экране Жэня Кунскі. Таксама ў складзе акцёраў задзейнічаны Стэфанія Станюта, Генадзь Габрук і іншыя. А песні «Я жывы» і «Беларусія мая» ў выкананні Сяргея Белікава дадаюць асобных эмоцый кінатвору. Чым не нагода сабрацца ўсёй сям'ёй за праглядам добрага фільма. «Беларусь 3» чакае на сеанс!

Алена ДРАПКО.

ШАХМАТНЫ КЛУБ

Выпуск № 133

Сваю новую задачу даслаў наш чытач Мікалай Быкаў з вёскі Рэпічы Баранавіцкага раёна ***(гл. дыяграму).***

Белыя: Крf5, Лс3, Лс8, Сb2, Сg8, Кd7, Кe7, пп. d6, f7, h5 (10).

Чорныя: Крg7, Фа1, Лb8, Лd8, Сh8, пп. b5, c2, d2, g5, h6 (10).

Мат за 2 хады.

Прапануем чытачам гэтую задачу для самастойнага рашэння. Дасылайце адказы на адрас рэдакцыі (вул. Хмяльніцкага, 10а, 220013, г. Мінск, «Звязда») або на электронны адрас вядучага аддзела: vadim_ne67@mail.ru.

* * *

Мемарыял Міхаіла Чыгорына ў Пецярбургу (272 удзельнікі), які мы згадвалі ў мінулым выпуску, выйграў беларускі гросмайстар Аляксей Фёдараў, — 7,5 бала з 9. Аляксей Аляксандраў заняў 11-е месца, Максім Царук — 28-е, Арцём Сіняўскі — 45-е.

Аляксей Фёдараў — Максім Царук. 1. e4 e5 2. Kf3 Kc6 3. Cc4 Cc5 4. c3 Kf6 5. d3 a6 6. Kbd2 0-0 7. Cb3 Ca7 8. h3 d5 9. 0-0 d4 10. Kc4 Kd7 11. cd C:d4 12. Cg5 Фe8 13. Ke3 Kc5 14. Kd5 Фd7 15. K:d4 K:d4 16. Фh5 Kce6 17. Kf6+ gf 18. C:f6 Лd8 19. Лae1 Kpf8 20. Лe3 K:b3 21. Лg3 Фd6 22. ab Крe8 23. Лg8+ Kf8 24. C:d8 Ф:d8 25. Ф:e5+ Фe7, 1:0.

* * *

Віталь Цецераў выйграў мемарыял Дзмітрыя Парамонава, які прайшоў у Наваполацку.

У Брэсце адбыўся традыцыйны фестываль «Чорная пешка» з шэрагам турніраў для дзяцей і дарослых, сеансаў адначасовай гульні, іншых спаборніцтваў (напрыклад, па шахматных паддаўках, разгадванні задач і крыжаванак і г. д.). Пераможцамі ў хуткіх шахматах сталі Міхаіл Яшчук і Варвара Палякова, у бліцы — Дзяніс Лазавік і Аляксандра Тарасенка.

* * *

У Рызе прайшлі буйныя турніры сярод мужчын і жанчын, зладжаныя Міжнароднай шахматнай федэрацыяй. Іх пераможцы трапляюць у наступныя турніры прэтэндэнтаў на суветную карону і Кубак свету, таму паўдзельнічаць пажадалі многія вядомыя шахматысты.

У жаночым турніры (50 удзельніц) паспяхова выступіла (4—7-е месцы) Вольга Бадэлька. Праўда, зараз яна вучыцца ў расійскім універсітэце і выступае за Расійскую шахматную федэрацыю, але як шахматыстка стала вядомая менавіта ў Беларусі. Вось дзве партыі з Рыгі, дзе Вольга перамагла шахматыстак з Украіны і Расіі.

Вольга Бадэлька — Юлія Осьмак. 1. e4 e6 2. d4 d5 3. Kc3 Kf6 4. e5 Kfd7 5. f4 c5 6. Kf3 Kc6 7. Ce3 Фb6 8. Ka4 Фc7 9. c3 c4 10. b4 a5 11. a3 Ce7 12. Ce2 0-0 13. 0-0 b5 14. Kc5 K:c5 15. dc f6 16. ef C:f6 17. Лc1 ab 18. ab Лa2 19. Лf2 Ke7 20. Лc2 Л:c2 21. Ф:c2 Cd7 22. Фd2 Kf5 23. g4 K:e3 24. Ф:e3 g6 25. Cf1 Cg7 26. Kd4 Лe8 27. Cg2 Kph8 28. Kf3 Лf8 29. Kg5 Фc8 30. h4 Фd8 31. Kf3 Cc8 32. g5 Фc7 33. Kd4 Cd7 34. Ch3 e5 35. fe Л:f2 36. Кр:f2 C:h3 37. Ф:h3 C:e5 38. K:b5 Фb8 39. Фf3 Cg7 40. Kd6 d4 41. cd C:d4+ 42. Крe2 h5 43. Фe4 Cg7 44. Фe8+ Ф:e8+ 45. K:e8 Ce5 46. c6, 1:0.

Лея Гарыфуліна — Вольга Бадэлька. 1. e4 e5 2. Kf3 Kc6 3. Cb5 f5 4. d3 fe 5. de Kf6 6. Kc3 Cb4 7. Фd3 d6 8. Cg5 h6 9. Cd2 Ce6 10. Kh4 C:c3 11. C:c3 0-0 12. Kg6 Лe8 13. 0-0 Kph7 14. Kh4 g5 15. Kf5 C:f5 16. ef a6 17. Ca4 d5 18. Лfe1 Фd6 19. Лad1 b5 20. Cb3 Лad8 21. h4 gh 22. Фh3 Лg8 23. Ф:h4 Лg4 24. Фh3 Лdg8 25. g3 Л8g5 26. Фg2 d4 27. Ce6 e4 28. Kph2 Фc5 29. Cd2 Лh5+ 30. Крg1 Ke5 31. b4 Фc6 32. Крf1 Kf3 33. Cc1 Лh2 34. Ф:h2 K:h2+ 35. Крg2 e3+ 36. Кр:h2 Фf3, 0:1.

* * *

Задача В. Жука з мінулага выпуску рашаецца: 1. Ce1 Крe3 2. Kd2 і 3.Лe4x, 1...Кр:e1 2. Cd3 і 3. Лb1x. Аўтар дадае, што маецца задача-блізня (Крe2 на h3, без nb6): 1. Лb5 Крg4 2. Cd1+ Kph3 3. Лh5x. Першыя правільна адказалі Фёдар Карпей, Ігар Ананіч, Сяргей Цяльпук, Васіль Барысевіч.

Вадзім ЖЫЛКО.

Самае цікавае ў свежым нумары часопіса «Алеся»

«КАЛІ ХУДНЕЮ, МЕНШ ПРАПАНОЎ...»

Госцяй рэдакцыі часопіса «Алеся» гэтым разам стала актрыса **Алена ДУБРОЎСКАЯ.** Большасць ведаюць яе па фільмах і серыялах: яна здымалася ў карцінах «Шырокая рака», «Інстытут высакародных дзяўчат», «Усё, што нам трэба», «Талаш», «Крывінушка», «Ой, ма-мач-кі!», «Аўташкола», «Нераскрыты талент, «Рая ведае ўсё!» і інш. А камусьці яна запомнілася як вядучая кулінарнага тэлешоу і вакалістка.

Як расказала Алена, рэжысёры ніколі не патрабавалі ад яе схуднець. «Мяне выбіраюць за славянскую, апетытную знешнасць. Калі худнею, наадварот, атрымліваю менш прапаноў. Часам на кінапробах мне кажуць расчаравана: чаму на фота вас значна больш?..»

ДВА БЕРАГІ АДНОЙ РАКІ

У раздзеле «Псіхалогія адносін» абмяркоўваецца пытанне, як мужчыну і жанчыне здабыць гармонію і знайсці згоду на доўгія гады. Што ў паводзінах адно аднаго часцей за ўсё цяжка зразумець?

Чаму жанчыны добра памятаюць даты важных падзей: дзень вяселля, дні нараджэнняў блізкіх, а мужчыны — не? Калі і па якой прычыне мужчыны ўключаюцца ў дамашнія работы, бяруць на сябе клопат пра дзяцей? На гэтыя і шмат яшчэ якіх «чаму» вы знойдзеце адказ у «Алесі».

ВЯЗАНАЕ АДЗЕННЕ І АКСЕСУАРЫ

У модных калекцыях сезона восень—зіма 2021/2022 вязаныя рэчы займаюць адно з цэнтральных месцаў. Іх можна ўбачыць як у офісным адзенні, так і ў камплектах для вуліцы. Галоўны модны дэвіз сезона — утульнасць і камфорт.



Вязаныя аксесуары — таксама актуальны акцэнт. Шапкі, шалікі, пальчаткі або рукавіцы — у часопісе «Алеся» прапануюцца шмат цікавых вобразаў і небанальных рашэнняў.

ЛЮБІМЫ ДЭСЕРТ — МАРМЕЛАД

Нягледзячы на тое што радзімай мармеладу лічыцца Блізкі Усход і Міжземнамор'е, і на нашых тэрыторыях здаўна садавіну і ягады было прынята ўварваць да максімальнага згушчэння. Беларускія гаспадынькі традыцыйна ўварвалі розныя ягады: ад малін да шыпшыны, а замест цукру ўжывалі мёд. «Алеся» прапануе некалькі рэцэптаў старажытнага ласунку.

МАРМЕЛАД ЛІТОЎСКІ АД ВІНЦЭНТЫ ЗАВАДСКАЙ

Інгрэдыенты: *2 кг позніх яблыкаў, 1 кг цукру, скуркі лімона.*

Як гатаваць. Яблыкі абабраць, нарэзаць на долькі, акуратна выняць сярэдзінкі і пакласці нарыхтоўку ў халодную ваду. Праз гадзіну ваду адцадзіць, пакласці яблыкі ў каструлю і паставіць на агонь, часта памешваючы варыва, каб не прыстала да дна. Калі яблыкі разварацца ў кашу, працерці праз сіта, змяшаць з цукрам і дробна нарэзанай скуркай лімона. Укласці масу ў каструлю і гатаваць, бесперапынна мяшаючы драўлянай лыжкай. Калі пры каштаванні мармеладу з яго цягнуцца «ніткі», то ён гатовы. Захоўваць трэба ў халодным месцы.

Беларусь 1

6.00, 7.20, 8.15 Добрай раніцы, Беларусь!
7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00 Навіны.
7.05, 8.05 Навіны эканомікі.
7.10, 8.10, 18.15, 1.05 Зона Х (16+).
9.10 Галоўны эфір.
10.40, 12.10, 18.35, 19.20 Драма «Капітанша-2» (16+).
13.05, 15.25 Драма «Трэці павінен пайсці» (16+).
15.10, 18.00 Навіны рэгіёна.
17.05 Беларускі час.
21.00 Панарама.
21.45 Зразумелая палітыка.
22.00 Серыял «След» (16+).
0.45 Арэна.
1.25 Дзень спорту.

Беларусь 2

6.00 «Уключайся!» (12+)
9.00, 11.15, 21.05 Тэлебарометр.
9.05, 19.50 «Зразумець. Прабачыць» (16+).
10.25 «На тыдзень» (16+).
11.45 Серыял «Стыч!» (6+)
12.30 «Воблачна, магчымы ападкі ў выглядзе фрыкадэлек» (0+).
14.00 «Уся сям'я» (6+).
14.55 Фільм «Некіруемы» (12+).
14.00, 21.15 Тэлечасопіс Eurosport Winter Pass #1 (16+).
18.30 Лыжныя гонкі. КМ (6+).
19.05, 23.30 Скачкі на лыжах з трамплiна. КМ. Мужчыны (16+).
20.10 Скачкі на лыжах з трамплiна. КМ. Жанчыны (16+).
21.45 Навіны (16+).

Кінакамедыя

0.05 Развод па-французску (16+).
1.40 Ліцэнзія на шлюб (12+).
3.40 Прымадонна (16+).
5.45 Вялікі тата (12+).
7.25 Колькі ў цябе? (16+)
9.20 Маска Зора (12+).
11.55 Легенда Зора (6+).
14.20 Руковая пантэра (12+).
16.00 Руковая пантэра-2 (12+).
17.40 Падмануць усіх (16+).
19.30 Кучарашка Сью (12+).

21.20 Чаго хоча Джульета (16+).
23.10 Круты і цыпачкі (12+).

ТБ3

6.00 Калекцыя «Беларусьфільма» (12+).
7.50 «Вой, ма-мач-кі!-2» (12+).
8.50 «Ганна-дэтэктыў» (16+).
9.45 «Паглядзім» (12+).
10.25 «Вялікая маленькая хлусня». Серыял (16+).
11.50 «Знакі лёсу» (16+).
12.30, 18.40, 3.10 «Сляпая» (16+).
13.35, 17.30, 2.10 «Варажбітка» (16+).
14.45 «Старац» (16+).
15.25 «Містычныя гісторыі» (16+).
16.30, 3.40 «Якія вярнулі ся» (16+).
19.50 «Чума 2020». Дак. фільм (16+).
20.45 «Чалавек-невідзімка» (16+).
21.55 «Апошні легіён» (16+).
0.00 «Сайлент Хіл» (16+).
4.30 «Суд ідзе». Серыял (16+).

ТБ1000

5.40 Ізгой (12+).
8.35 Тэрмінал (12+).
11.00 Форэст Гамп (12+).

13.35 Шэрлак: брыдкая нявеста (16+).
15.20, 17.10, 19.00 Шэрлак (16+).
20.45 Баявы конь (12+).
23.25 Чатыры пёры (16+).
1.40 Застанься (16+).
3.20 Вапільнае неба (16+).

ТБ1000 Рускае кіно

7.00 Калідор неўміручаці (12+).
9.55 Бітва за Севастопаль (12+).
12.10 Чырвоная здань (16+).
14.00 Калашнікаў (12+).
15.55, 16.45, 18.00, 18.55 Нюхач (16+).
19.55 Ледакол (12+).
22.10 Край (16+).
0.25 Ржэў (12+).
2.25 Выратаваць Ленінград (12+).
3.55 28 панфілаўцаў (12+).

National Geographic

6.00 Навуковыя глупствы (16+).
6.30 Рыбы-пачвары (16+).
7.20 Інстынкт выжывання, Кітай (16+).
8.10 Ледзяная дарога (16+).
9.00 Востраў бунтароў (16+).
9.55, 10.45, 17.35 АўтаSOS (16+).
11.40 Дзікі тунец (16+).
12.25, 16.45 Дзіўны аэрапорт Нью-Ёрка (16+).
13.20, 23.35 Даследчык 2.0. (16+).
14.10, 0.25 У дзікай прыродзе з Беарам Грылсам (16+).
15.00 Кантрабанда з Марыянай ван Зэлер (16+).
15.50 Злавіць кантрабандыста (16+).
18.30, 18.40 Фабрыка ежы ў Амерыцы (16+).
19.10, 20.05, 2.45 Расследаванні авіякатастроф (16+).
21.00, 3.30 Найбуйнейшыя тэхнагенныя катастрофы (16+).
21.50 Патанулыя скарбы нубійскіх фараонаў (16+).
22.45 Уварванне на Зямлю (16+).
1.15 Мяжа (16+).
2.00 Суперзбудаванні Трэцяга рэйха (16+).
4.20 Асушыць акіян (16+).
5.05, 5.35 Гульні розуму (16+).

Discovery

8.00, 7.35 Як гэта зроблена? (12+)
8.25, 11.10, 16.40, 22.10 Махінатары (12+).
9.20, 9.45, 20.20, 20.45 Паляўнічыя на склады (16+).
10.15, 10.40, 21.15, 21.40 Як гэта ўстроена? (12+)
12.05, 13.00 Залатая ліхаманка (16+).
13.55, 14.20, 14.50, 15.15, 15.45, 16.10 Бітвы скарбашукальнікаў (12+).
17.35 Эд Стафард: той, хто выжыў (16+).
18.30, 18.55 Кафэ, закусачныя і забягалаўкі (12+).
19.25, 4.27 Хуткія і гучныя (16+).
23.05, 5.14 Аляска: сям'я з лесу (16+).
0.00, 6.01 Аляска: апошняя мяжа (12+).
0.55, 6.48 Паляўнічыя на дыназаўраў (12+).
1.50, 2.45, 3.40 Чыгунка Аляскі (16+).

У праграме магчымы змяненні. Перадрукоўка праграмы забаронена. [СЦ] – фільм транслюецца са скрытымі субцітрамі.

Беларусь 1

6.00, 7.30, 8.30 Добрай раніцы, Беларусь!
7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00 Навіны.
7.20, 8.20 Навіны эканомікі.
7.25, 8.25, 18.15 Зона Х (16+).
9.10 Серыял «След» (16+).
10.50 «Скажынемаўчы».
11.45, 12.10, 13.05, 18.45, 19.20 Драма «Капітанша-2» (16+).
14.00 «Здорава здаровым быць!» (6+) [СЦ]
14.45, 15.25 Драма «Чаўночніцы. Працяг» (16+).
15.10, 18.00 Навіны рэгіёна.
17.05 Сэнс жыцця (12+).
17.30 Маршрут пабудаваны (12+).
21.00 Панарама.
21.45 Клуб рэдактараў (16+).
22.50 Драма «Бестселер па каханні» (12+).
0.55 Дзень спорту.

Беларусь 2

6.00 «Уключайся!» (12+)
9.00, 17.50 Тэлебарометр.
9.05 Серыял «Сляпая» (16+).
10.10 «Экстрасенсы-дэтэктывы» (16+).
11.15 Серыял «Шпік-2» (16+).
13.20 «Сямейныя гісторыі» (16+) [СЦ].
13.55 Серыял «Жаночы доктар-4» (16+).
14.55 «Арол і рэшка. Цуды свету-3» (16+).
15.55 Нічога сабе ньюз (12+).
16.00 «ПІН_КОД» (12+).
16.55 «Вежа» (12+).
17.55 «Паненка-сялянка» (16+).
18.55 «Клон». Серыял (16+).
19.55, 21.15 «Тата папаў» (16+).
21.10 Спортлато 5 з 36, КЕНА.
21.55 «Амаль былыя» (16+).
23.50 Дэтэктыў «Жанчына ў чорным» (16+).

Беларусь 3

7.00 «Дабраранак».
7.35 «Беларуская кухня».
8.05, 12.00, 19.40, 23.45 Навіны культуры.
8.25, 18.10 «Апошні дзень» (12+).
9.00, 16.30 «Дочкі-маці». Маст. фільм (12+) [СЦ].
10.40 «Запіскі на палях» [СЦ].
11.05, 18.45 Сероыял «Жукаў» (16+) [СЦ].
12.20 «Сіла веры».
12.50 «Наперад у мінулае».
13.20, 21.05 Серыял «Сямнаццаць імгненняў вясны» (12+) [СЦ].
15.50 «Люблю і памятаю».
20.00 «Кафедра».
20.10 «Я хачу гэта ўбачыць!» (6+)
20.40 «Калыханка» (0+).

Беларусь 5

7.00 Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. «Баер» (Германія) — «Селтык» (Шатландыя).
8.55, 21.00 Плаванне. Ліга ISL.
11.00 Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. «Манака» (Францыя) — «Рэал Сасьедад» (Іспанія).
12.55 Хакей для ўсіх.
13.30 Фігурнае катанне. Гранпры. Мужчыны.
15.10 Вось гэта спорт!
15.30, 23.10 Фігурнае катанне. Гран-пры. Танцы на лёдзе.
16.50 Аўтаспорт. Экстрым-Е.
17.20 Свет англійскай прэм'ер-лігі.
17.50, 19.10, 23.00 Спорт-цэнтр.
18.00 Фігурнае катанне. Гранпры. Пары.
19.25 Фігурнае катанне. Гранпры. Жанчыны.

АНТ

6.00, 7.10, 8.10, 9.10 «Наша раніца».
6.30, 7.00, 07.30, 8.00, 08.30, 9.00, 11.00, 16.00, 18.00 [СЦ], **20.30** Нашы навіны.
10.00 «Жыць здорава!» (16+)
11.15 «Модны прысуд» (6+).
12.20 «Бесталковыя нататкі» (12+).
13.15, 0.25 Фільм «Жанчына ў бядзе-3» (16+).
15.05 «Давай пажэнімся!» (16+)
16.20 «Трывожная кнопка». Галоўнае (16+).
16.45, 18.20 «Мужчынскае / Жаночае» (16+).
18.50 «Поле цудаў» (16+).
20.00 Час.
21.15 «Лепш за ўсіх!» (0+)
23.00 «Што? Дзе? Калі» ў Беларусі (16+).

СТБ

6.00, 6.40, 7.45, 8.40 «Раніца СТБ».
6.30 [СЦ], **7.30** [СЦ], **8.30** [СЦ], **10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** Навіны «24 гадзіны».
9.00, 0.05 «Загадкі чалавецтва з Алегам Шышкіным» (16+).
10.00 «Глядзець усім!» (16+).
10.40 «Як уладкаваны свет» (16+).
12.25, 21.00, 0.55 «Самыя шакавальныя гіпотэзы» (16+).
13.45, 23.20 «Таямніцы Чапман» (16+).
14.35, 21.45 «Неверагодна цікавыя гісторыі» (16+).
15.45, 16.50 «Ленінград 46». Серыял (16+).
20.30, 23.15 «СТБ-спорт».
20.35 «Сталічныя падрабязнасці».
20.45 «Міншчына».

МІР

5.00 Серыял «Растоў-тата» (16+).
6.20, 10.20 Серыял «Меч» (16+).
10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 3.00, 4.00 Навіны (бягучы радок).
10.10 «У гасцях у лічбы» (12+).
13.15 «Справы судовыя. Грошы вярніце!» (16+)
14.10, 16.20 «Справы судовыя. Бітва за будучыню» (16+).
15.05 «Справы судовыя. Новыя гісторыі» (16+).
17.20 Маст. фільм «Дамы запрашаюць кавалераў» (12+).
19.15 «Слабае звяно» (12+).
20.15 «Сусветныя гульні розуму» (12+).
20.55 Маст. фільм «Сцеражыся аўтамабіля» (12+).
22.50 Маст. фільм «Матч» (12+).
2.10 Дак. фільм «Якія выжылі» (16+).
2.45 Спецыяльны рэпартаж (12+).
2.55 «Еўразія. Культурна» (12+).
3.15, 4.15 Мір. Меркаванне (12+).
3.30 Мір. Спорт (12+).
3.35 «5 прычын застацца дома» (12+).
3.45 «Легенды Цэнтральнай Азіі» (12+).
3.55 «Еўразія ў трэндзе» (12+).
4.25 «Еўразія. Спорт» (12+).
4.35 «Зроблена ў Еўразіі» (12+).
4.45 Маст. фільм «Маё каханне» (6+).

РТР—Беларусь

6.05 «Новая раніца».
11.00, 14.00, 17.00, 20.00 Весткі.
11.30 «Пра самае галоўнае» (12+).
12.35, 14.35 Серыял «Таямніцы следства» (16+).
13.50, 16.50, 19.50, 23.00 Навіны — Беларусь.
15.40 «Кропкі над і» (16+).
17.15 «60 хвілін» (12+).
18.30 «Андрэй Малахаў. Прамы эфір» (16+).
21.00 «Гумарына-2021» (16+).
22.45, 23.10 Маст. фільм «Жыццё пасля жыцця» (12+).

НТБ—Беларусь

6.00 «Астрапрагноз».
6.05, 7.10, 8.20, 16.20, 19.40, 22.15, 23.30 Сёння. Галоўнае.
6.10 Спорт-мікс.
6.20 «Здароўе» (12+).
7.25 «Маршрут пабудаваны» (12+).
8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00 Сёння.
8.35, 22.20 «НЗ.by».
8.55 Пракурорская праверка (16+).
10.25 Серыял «Мухтар. Новы след» (16+).
12.15, 13.45 Серыял «Ляснік» (16+).
13.20 Надзвычайнае здарэнне.
13.55 Серыял «Ляснік. Свая зямля» (16+).
16.30 Гісторыі выратавання (12+).
16.55 «Чакай мяне» (12+).
17.55 «ДНК» (16+).
19.55, 22.50, 23.45 Дэтэктыў «Пёс» (16+).
0.20 «Падазраюцца ўсе» (16+).

8 канал

7.00, 13.45, 18.50, 21.05, 1.00 «Надвор'е» + «Эрана».
7.05 Мультпарад. «Качыныя гісторыі» (6+).
7.30, 13.50 «Прыколы 13-й школы» (6+).
7.35 Серыял «Героі» (16+).
8.20 Серыял «Тэрмінатар. Бітва за будучыню» (16+).
9.05 Дак. фільм «Непал».
9.55 Трылер «Наёмнікі» (16+).
12.10 Серыял «Яна напісала забойства» (12+).
13.55 Мультпарад. «Лэдзі Баг і Супер Кот» (6+).
14.20 «Хачу ў Парыж» (12+).
14.25 «Гатуй як шэф» (12+).
14.40 Серыял «Супермэн і Лоіс» (16+).
15.25 Серыял «Чорна-белае каханне» (16+).
17.10 Серыял «Тэорыя Вялікага выбуху» (16+).
17.30 Камедыя «Мы з розных светаў».
18.55 Серыял «Афганцы» (16+).
20.55 «Вечарніца» (0+).
21.10 Баявік «Гісторыі зорных войнаў» (12+).
23.20 Серыял «Апавяданне служанкі» (18+).

ВТБ

6.05, 7.00, 9.00 «Раніца з гумарам» (16+).
11.00, 22.30 «КВЗ. Панашаму» (16+).
12.00 «Наш рамонт» (16+).
12.35 «Дурні і дарогі» (16+).
13.00 Драма «Нявеста, якая збегла» (12+).
15.20 «Уральскія пельмені» (16+).
15.55 Серыял «Вароніны» (12+).
17.00 Серыял «Дылды» (16+).
18.30 Серыял «Гранд» (16+).
20.00 Серыял «Бацькам» (16+).
21.00 «Суперліга» (16+).
23.30 Фантастыка «Вікінгі» (16+).
1.25 Серыял «Псіхалагіні» (16+).
2.20 Серыял «Метад Лаўровай» (16+).
4.10 Серыял «Маладзёжка» (16+).
5.00 «6 кадраў» (16+).

Культура

6.30, 7.00, 7.30, 8.30, 10.00, 15.00, 19.30, 23.40 Навіны культуры.
6.35 «Пешшу...»
7.05, 20.05 «Правілы жыцця».
7.35, 18.35 «Катастрофы Старажытнага свету» [СЦ].
8.35 Легенды сусветнага кіно.
9.00, 16.35 «Юркіны світанні». Маст. фільм.
10.15 «Назіральнік».
11.10, 0.00 XX стагоддзе.
12.15 «Такая жыза Даніда Сайфулоева». Дак. фільм.
12.35, 22.20 «Міхайла Ламаносаў». Маст. фільм [СЦ].
13.50 Штучны адбор.
14.30 «Справа №. Войны паручніка Талстога». Серыял [СЦ].
15.05 Навіны. Падрабязна. Кіно.
15.20 «Біблейскі сюжэт».
15.50 «Белая студыя».
17.35, 2.00 Зальцбургскі фестываль.
19.45 «Галоўная роля».
20.30 «Добрай ночы, малыя!»
20.50 «Абсалютны слых».
21.35 Улада факта.
1.05 «Вулкан, які змяніў свет». Дак. фільм [СЦ].

Настальгія

6.00 «СевАлогія» (18+).
6.55, 13.20 Маст. фільм «Восеньская гісторыя» (16+).
8.10 Кінаканцэрт «На біс» (12+).
9.00, 15.00, 21.00, 3.00 «Мінулы час» (12+).
9.40, 11.00, 13.05, 14.35, 15.40, 17.00, 21.40, 23.00, 0.55, 3.40 Музычная настальгія (12+).
10.00, 16.00, 22.00, 0.00 «Народжаныя ў СССР» (12+).
12.00 «Быў час» (16+).
18.00 «Спяем, сябры!» (12+)
19.00 Маст. фільм «Барханаў і яго целаахоўнік» (18+).
1.35 «Праграма А» (18+).
4.00 Маст. фільм «Мяшчэрскія» (18+).
5.25 «Блеф-клуб» (16+).

EuroSport 1

2.30, 10.30, 14.30 Тэлечасопіс ERC All Access (16+).
3.00 Кёрлінг. ЧЕ (6+).
3.30, 4.15, 12.30, 13.15 Горныя лыжы. КМ. Жанчыны (16+).
5.00, 11.00, 16.00, 17.30, 22.00, 22.30 Снукер. UK Championship (6+).
7.00, 7.45 Горныя лыжы. КМ. Мужчыны (16+).
8.30, 15.00 Скачкі на лыжах з трамплінаў. КМ (16+).
9.30 Аўтагонкі на выносліваць (16+).
14.00 Тэлечасопіс Eurosport Winter Pass #1 (16+).
21.30 Тэлечасопіс «Дух парыснага спорту» (16+).
22.25 Навіны (16+).

Кінакамедыя

1.10 Укол парасонам (16+).
3.35 Нявеста, якая збегла (16+).
5.40 Хлопец з нашых могілак (12+).
7.20 Дом з паранармальнымі з'явамі (16+).
8.55 Круты і цыпачкі (12+).
10.45 Красуні на ўцёках (16+).
12.25 Руковая пантэра-2 (12+).
14.05 Што магло быць горш? (12+)

15.55 Развод па-французску (16+).
17.30 Колькі ў цябе? (16+)
19.30 Дзевяць ярдаў-2 (16+).
21.20 Сяброўства і няшчасце? (16+)
23.10 Вялікі тата (12+).

ТБ3

6.00 Калекцыя «Беларусьфільма» (12+).
8.10 «Вой, ма-мач-кі!-2» (12+).
9.10 «Ганна-дэтэктыў» (16+).
10.10, 4.15 «Перыскоп» (16+).
10.35 «Вялікая маленькая хлусня». Серыял (16+).
12.05 «Знакі лёсу» (16+).
12.45, 18.00 «Сляпая» (16+).
13.55, 19.10, 3.20 «Варажбітка» (16+).
15.05 «Старац» (16+).
15.45, 2.30 «Містычныя гісторыі» (16+).
16.55 «Пятая варта». Серыял (16+).

20.20 «Звышнатуральнае». Серыял (16+).
23.05 «Аванпост» (16+).

ТБ1000

0.10 «Лінія абароны» (16+).
0.50 «Гогаль. Вій» (16+).
4.30 «Суд ідзе». Серыял (16+).

ТБ1000 Рускае кіно

5.00 Рамэа і Джульета (12+).
6.55 Мумія (12+).
9.15 Мумія вяртаецца (12+).
11.35 Мумія: грабніца імператара драконаў (16+).
13.35, 15.20, 17.10 Шэрлак (16+).
19.00 Цар скарпіёнаў (12+).
20.35 Бібліятэкар: у пошуках кап'я лёсу (16+).

22.20 Белфягор — прывід Луўра (12+).
0.10 Код да Вінчы (16+).
2.40 Анёлы і дэманы (16+).

National Geographic

6.00, 6.15, 5.35 Навуковыя глупствы (16+).
6.40 Рыбы-пачвары (16+).
7.30 Інстынкт выжывання (16+).
8.20, 16.45 Ледзяная дарога (16+).
9.10 Вастраў бунтароў (16+).
10.00, 10.55, 17.35 АўтаSOS (16+).
11.45, 21.00, 3.25 Дзікі тунец (16+).
12.35 Ледзяная дарога (16+).
13.25, 23.30 Даследчык 2.0. (16+).
14.15, 0.25 У дзікай прыродзе з Беарам Грылсам (16+).
15.05 Кантрабанда з Марыянай ван Зэлер (16+).
15.50 Злавіць кантрабандыста (16+).
18.30, 18.40 Фабрыка ежы ў Амерыцы (16+).
19.10, 20.05, 2.40 Расследаванні авіякатастроф (16+).
21.50 Дзікі тунец: Поўнач супраць Поўдня (16+).
22.40 Уварванне на Зямлю (16+).
1.05 Мяжа (16+).
1.55 Супербудаванні Трэцяга рэйха (16+).
4.05 Асушыць акіян (16+).
4.55, 5.20 Гульні розуму (16+).

Discovery

8.00, 7.35 Як гэта зроблена? (12+)
8.25, 11.10, 16.40, 22.10 Махінатары (12+).
9.20, 9.45, 20.20, 20.45 Паляўнічыя на склады (16+).
10.15, 10.40, 21.15, 21.40, 1.50, 2.15, 2.45, 3.10, 3.40, 4.04 Як гэта ўстроена? (12+)
12.05 Прыз Earthshot: рамонт нашай планеты (12+).
13.00 Крушэнне «Эстоніі» (16+).
13.55 Невядомая экспедыцыя (12+).
14.50, 15.45 Што магло пайсці не так? (16+)
17.35 Эд Стафард: гульня на вылет (16+).
18.30, 18.55 Кафэ, закусачныя і забягалаўкі (12+).
19.25, 4.27 Хуткія і гучныя (16+).
23.05, 5.14 Голыя і напалоханыя (16+).
0.55, 6.48 Уцячы ад пагоні (16+).

У праграме магчымы змяненні. Перадрукоўка праграмы забаронена. [СЦ] – фільм транслюецца са скрытымі субцітрамі.

чацвер, 25 лістапада ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

Беларусь 1

6.00, 7.20, 8.15 Добрай раніцы, Беларусь!
7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00 Навіны.
7.05, 8.05 Навіны эканомікі.
7.10, 8.10, 18.15, 0.30 Зона Х (16+).
9.10, 22.15 Серыял «След» (16+).
10.50 «Скажынемаўчы».
11.45, 12.10, 13.05, 18.35, 19.20 Драма «Капітанша-2» (16+).
14.00 «Здорава здаровым быць!» (6+) [СЦ]
14.40, 15.25 Драма «Чаўночніцы. Працяг» (16+).
15.10, 18.00 Навіны рэгіёна.
17.05 Беларускі час.
21.00 Панарама.
21.45 Адзін дзень (12+).
0.10 Сфера інтарэсаў.
0.50 Дзень спорту.

Беларусь 2

6.00 «Уключайся!» (12+)
9.00, 17.50 Тэлебарометр.
9.05, 20.00 Серыял «Сляпая» (16+).
10.10, 0.35 «Экстрасэнсы-дэтэктывы» (16+).
11.15, 22.20 Серыял «Шпік-2» (16+).
13.30 «Сямейныя гісторыі» (16+).
14.00, 21.20 Серыял «Жаночы доктар-4» (16+).
15.00 «Багіня шопінгу. Экстрэмальны сезон» (16+).
15.55 Нічога сабе ньюз (12+).
16.00 «ПІН_КОД» (12+).
16.55 «Вежа» (12+).
17.55 «Арол і рэшка. Цуды свету-3» (16+).
18.55 «Клон». Серыял (16+).
21.10 Спортлато 6 з 49, КЕНА.

Беларусь 3

7.00 «Дабраранак».
7.35, 12.20 «Беларуская кухня».
8.05, 12.00, 19.40, 23.25 Навіны культуры.
8.25, 18.00 «Апошні дзень» (12+).
9.00, 16.25 «Радня». Маст. фільм (12+) [СЦ].
10.35 «Камертон».
11.05, 18.40 Серыял «Жукаў» (16+) [СЦ].
12.50 «Наперад у мінулае».
13.20, 21.05 Серыял «Сямнаццаць імгненняў вясны» (12+) [СЦ].
15.45 «Люблю і памятаю».
20.00 «Кафедра».
20.10 «Я хачу гэта ўбачыць!» (6+)
20.40 «Калыханка» (0+).

Беларусь 5

7.00, 22.50 Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Анлайн гульнявога дня.
8.55 Між іншым.
9.15 Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. «Бешыкташ» (Турцыя) — «Аякс» (Нідэрланды).
11.10 Гандбол. Ліга чэмпіёнаў. «Заграб» (Харватыя) — «Мяшкоў-Брэст» (Беларусь).
12.40 Слэм-данк.
13.10 Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. «Манчэстэр Сіці» (Англія) — ПСЖ (Францыя).
15.10 Фігурнае катанне. Гран-пры.
16.15 Хакей для ўсіх.
16.50 Хакей. КХЛ. «Металург» (Магнітагорск) — «Дынама-Мінск».
19.20 Баскетбол. Кваліфікацыя да ЧС-2023. Мужчыны. Беларусь — Турцыя.
21.10 Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. «Лакаматыў» (Расія) — «Лацыё» (Італія).

АНТ

6.00, 7.10, 8.10 «Наша раніца».
6.30, 7.00, 07.30, 8.00, 08.30, 9.00, 11.00, 16.00, 18.00 [СЦ], **20.30, 0.50** Нашы навіны.
9.10 «Аб'ектыўНа» (16+).
10.10 «Жыць здорава!» (16+)
11.15 «Модны прыгавор» (6+).
12.20 «Бесталковыя нататкі» (12+).
13.15, 23.05 Фільм «Жанчына ў бядзе-2» (16+).
15.05 «Давай пажэнімся!» (16+)
16.20 «Мужчынскае / Жаночае» (16+).
17.20, 18.20 «На самай справе» (16+).
18.50 «Няхай гавораць» (16+).
20.00 Час.
21.15 «Маркаў. Нічога асабістага» (16+).
21.55 «Масгаз. Справа № 8: пастка» (16+).

СТБ

6.00, 6.40, 7.45, 8.40 «Раніца СТБ».
6.30 [СЦ], **7.30** [СЦ], **8.30** [СЦ], **10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** Навіны «24 гадзіны».
9.00, 0.05 «Загадкі чалавецтва з Алегам Шышкіным» (16+).
10.00 «Глядзець усім!» (16+)
10.40 «Як уладкаваны свет» (16+).
12.25, 21.00, 0.55 «Самыя шакавальныя гіпотэзы» (16+).
13.45, 23.20 «Таямніцы Чапман» (16+).
14.40, 21.50 «Неверагодна цікавыя гісторыі» (16+).
15.45, 16.50 «Ленінград 46». Серыял (16+).
20.30, 23.15 «СТБ-спорт».
20.35 «Сталічныя падрабязнасці».
20.45 «Міншчына».

МІР

5.00, 3.45 Серыял «Растоў-та-та» (16+).
6.30, 10.10, 22.15 Серыял «Меч» (16+).
10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 2.00, 3.00 Навіны (бягучы радок).
13.15 «Справы судовыя. Грошы вярніце!» (16+)
14.10, 16.20, 18.00 «Справы судовыя. Бітва за будучыню» (16+).
15.05 «Справы судовыя. Новыя гісторыі» (16+).
17.00 «Міравое пагадненне» (16+).
19.25 «Гульня ў кіно» (12+).
20.10 «Слабае звяно» (12+).
21.15 «Назад у будучыню» (16+).
1.10, 3.35 «Еўразія. Спорт» (12+).
1.20 «Нашы замежнікі» (12+).
1.30 «Старт-ап па-еўразійску» (12+).
1.40 «Еўразія. Культурна» (12+).
1.45 «Культ асобы» (12+).
1.50 «5 прычын застацца дома» (12+).
2.15, 3.15 Мір. Меркаванне (12+).
2.30 Спецыяльны рэпартаж (12+).
2.40 «Даслоўна» (12+).
2.50 «Еўразія. Рэгіёны» (12+).
3.25 «Разам выгадна» (12+).

РТР—Беларусь

6.05 «Новая раніца».
11.00, 14.00, 17.00, 20.00 Весткі.
11.30 «Аб самым галоўным» (12+).
12.35, 14.35 Серыял «Таямніцы следства» (16+).
13.50, 16.50, 19.50, 23.00 Навіны — Беларусь.
15.40 «Кропкі над і» (16+).
17.15 «60 хвілін» (12+).
18.30 «Андрэй Малахаў. Прамы эфір» (16+).
21.05 Серыял «Стэнаграма лёсу» (16+).
23.10 «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым» (12+).

НТБ—Беларусь

6.00 «Астрапрагноз».
6.05, 7.10, 8.20, 16.20, 19.40, 22.15, 23.30 Сёння. Галоўнае.
6.10 Спорт-мікс.
6.20 «Здароўе» (12+).
7.25 «Маршрут пабудаваны» (12+).
8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00 Сёння.
8.35, 22.20 «НЗ.by».
8.55 Пракурорская праверка (16+).
10.25 Серыял «Мухтар. Новы след» (16+).
12.15, 13.45 Серыял «Ляснік» (16+).
13.20 Надзвычайнае здарэнне.
16.30 Гісторыі выратавання (12+).
16.55 «За гранню» (16+).
17.50 «ДНК» (16+).
19.55 Дэтэктыў «Пёс» (16+).
21.05, 22.40, 23.45 Дэтэктыў «Па той бок смерці» (16+).
0.10 «Падазраюцца ўсе» (16+).

8 канал

7.00, 13.50, 16.45, 21.05, 0.30 «Надвор'е» + «Эрана».
7.05 Мультпарад. «Качыныя гісторыі» (6+).
7.30, 13.55, 20.45 «Прыколы 13-й школы» (6+).
7.35 Серыял «Героі» (16+).
8.20 Серыял «Тэрмінатар. Бітва за будучыню» (16+).
9.05 Серыял «Бразілія».
10.10 Вестэрн «Томстаўн: легенда Дзікага Захаду» (16+).
12.15 Серыял «Яна напісала забойства» (12+).
14.00 Мультпарад. «Лэдзі Баг і Супер Кот» (6+).
14.25 «Хачу ў Парыж» (12+).
14.30 Серыял «Супермэн і Лоіс» (16+).
15.15 Серыял «Чорна-белае каханне» (16+).
16.50 Серыял «Тэорыя Вялікага выбуху» (16+).
17.30 «7 цудаў».
18.05 Камедыя «Мы з розных светаў».
19.25 Серыял «Афганцы» (16+).
20.50 «Вечарніца» (0+).
21.10 Драма «Сланечнікі» (12+).
23.00 Серыял «Апавяданне служанкі» (18+).

ВТВ

6.05, 7.00, 9.00 «Раніца з гумарам» (16+).
11.00 «КВЗ. Па-нашаму» (16+).
12.00 «Гатуем як шэф» (16+).
12.35 «Дурні і дарогі» (16+).
12.50 Фантастыка «Вікінгі» (16+).
14.50 «Уральскія пельмені» (16+).
15.55 Серыял «Варонiны» (12+).
17.00 Серыял «Дылды» (16+).
18.30 Серыял «Гранд» (16+).
20.00 Серыял «Бацькам» (16+).
21.00 «Форт Баярд» (16+).
23.05 Камедыя «Астэрыкс і Абелікс: місія «Клеапатра» (12+).
1.10 Серыял «Псіхалагіні» (16+).
2.05 Серыял «Метад Лаўровай» (16+).
3.55 Серыял «Маладзёжка» (16+).
4.45 «6 кадраў» (16+).

Культура

6.30, 7.00, 7.30, 8.30, 10.00, 15.00, 19.30, 23.40 Навіны культуры.
6.35 «Пешшу...»
7.05 «Правілы жыцця».
7.35 «Вулкан, які змяніў свет». Дак. фільм [СЦ].
8.40 Колер часу.
8.50, 16.35 «Юркіны світанні». Маст. фільм.
10.15 «Назіральнік».
11.10, 0.00 XX стагоддзе.
12.30, 22.20 «Міхайла Ламаносаў». Маст. фільм [СЦ].
13.45 «Сяргей Танееў. Кантрапункт яго жыцця». Дак. фільм.
14.30 «Справа №. Міхаіл Лермантаў: гусарская трагедыя». Серыял [СЦ].
15.05 Навіны. Падрабязна. Тэатр.
15.20 «Ці вадзіліся львы ў Гарадцы?» [СЦ]
15.50 «2 Вернік 2».
17.45, 2.10 Зальцбургскі фестываль.
18.35, 1.15 «Падарожжа Магелана — у пошуках астравоў прыпраў». Дак. фільм [СЦ].
19.45 «Галоўная роля».
20.05 Адкрытая кніга [СЦ].
20.30 «Добрай ночы, малыя!»
20.50 «Канстанцін Цыялкоўскі. Правінцыя — космас». Дак. фільм [СЦ].
21.35 «Энігма. Іван Фішэр».

Настальгія

6.00 «Быў час» (16+).
7.05, 8.35, 9.40, 11.00, 15.40, 17.00, 18.45, 20.40, 21.40, 23.00, 3.40, 5.00 Музычная настальгія (12+).
7.20, 0.55 Маст. фільм «Восеньская гісторыя» (16+).

9.00, 15.00, 21.00, 3.00 «Мінулы час» (12+).
10.00, 16.00, 22.00, 4.00 «Народжаныя ў СССР» (12+).
12.00 «Спяем, сябры!» (12+)
13.00 Маст. фільм «Барханаў і яго целаахоўнік» (18+).
18.00 «Яловая субмарына» (16+).
19.20 Маст. фільм «Я свабодны, я нічый» (18+).
0.00 «СевАлогія» (18+).
2.10 Кінаканцэрт «На біс» (12+).

EuroSport 1

2.30, 10.30 Тэлечасопіс GolfTV Weekly (6+).
3.00, 4.30, 7.00 Горныя лыжы. КМ. Жанчыны (16+).
3.30, 8.00, 12.30, 13.00. Горныя лыжы. КМ. Мужчыны (16+).
05.00, 11.00, 17.000, 17.30, 21.30, 22.30 Снукер. UK Championship (6+).
9.00 Веласпорт-трэк. Ліга чэмпіёнаў (16+).
13.30 Тэлечасопіс Eurosport Winter Pass #1 (16+).
14.00 Кёрлінг. ЧЕ. Мужчыны.
22.25 Навіны (16+).

Кінакамедыя

0.45 Завадатары (16+).
2.30 Суперстар (16+).
4.10 Прасунуты (16+).
5.45 Неверагодны Бёрт Уандэрстоўн (12+).
7.35 Брыльянтавы паліцэйскі (12+).

9.25 Дом з паранармальнымі з'явамі-2 (18+).
10.55 Робін Гуд: мужчыны ў трыко (12+).
12.55 Кейт і Леа (12+).
15.05 Дзевяць ярдаў-2 (16+).
16.55 Маска Зора (12+).
19.30 Легенда Зора (6+).
21.55 Начное жыццё (16+).

ТБ3

6.00 Калекцыя «Беларусьфільма» (12+).
8.05 «Вой, ма-мач-кі!-2» (12+).
9.05 «Ганна-дэтэктыў» (16+).
10.00 «Улецы» (12+).
10.40 «Вялікая маленькая хлусня». Серыял (16+).
12.10 «Знакі лёсу» (16+).
12.50, 18.00, 2.40 «Сляпая» (16+).
14.00, 19.10, 3.35 «Варажбітка» (16+).
15.10 «Старац» (16+).
15.50 «Містычныя гісторыі» (16+).
16.55 «Пятая варта». Серыял (16+).
20.20 «Звышнатуральнае». Серыял (16+).
23.05 «Аванпост» (16+).
0.05 «10 самых» (16+).
0.40 «Прыцемкі. Сага (16+).
4.30 «Суд ідзе». Серыял (16+).

ТБ1000

5.00, 2.20 Зялёная міля (16+).
8.25 Цар скарпіёнаў (12+).

10.05 Бібліятэкар: у пошуках кап'я лёсу (16+).
11.55 Белфягор — прывід Луўра (12+).
13.40, 15.25, 17.10 Шэрлак (16+).
19.00 Ізгой (12+).
21.35 Тэрмінал (12+).
23.55 Форэст Гамп (12+).

ТБ1000 Рускае кіно

5.00 Гудбай, Амерыка (12+).
6.40 Дзень дурня (16+).
8.15 Унук касманаўта (12+).
9.45 Хатабыч (16+).
11.30, 22.00 Бітва за Севастопаль (12+).

13.40 Ржэў (12+).
15.55, 16.55, 18.00, 18.55 Нюхач (16+).
20.05 Калашнікаў (12+).
0.10 Чырвоная здань (16+).
1.55 Мужчына з гарантыяй (16+).
3.15 Глядзі як я (12+).
4.45 14+ (16+).

National Geographic

6.00, 6.15 Навуковыя глупствы (16+).
6.35 Рыбы-пачвары (16+).
7.30 Інстынкт выжывання (16+).
8.20 Ледзяная дарога (16+).
9.10 Вострaў бунтароў (16+).
10.00, 10.55, 17.35 АўтаSOS (16+).
11.45, 12.35, 16.45 Дзікі тунец (16+).
13.25, 23.35 Даследчык 2.0. (16+).
14.15, 0.30 У дзікай прыродзе з Беарам Грылсам (16+).
15.00 Кантрабанда з Марыянай ван Зэлер (16+).
15.55 Злавіць кантрабандыста (16+).
18.30, 18.40 Фабрыка ежы ў Амерыцы (16+).
19.10, 20.05, 2.45 Расследаванні авіякатастроф (16+).
21.00, 3.30 Дзіўны аэрапорт Нью-Ёрка (16+).
21.50 Міжнародны аэрапорт Дубай (16+).
22.45 Уварванне на Зямлю (16+).
1.15 Мяжа (16+).
2.00 Супербудаванні Трэцяга рэйха (16+).
4.15 Асушыць акіян (16+).
5.05, 5.35 Гульні розуму (16+).

Discovery

8.00, 7.35 Як гэта зроблена? (12+)
8.25, 11.10, 16.40, 22.10 Махінатары (12+).
9.20, 9.45, 20.20, 20.45 Паляўнічыя на склады (16+).
10.15, 10.40, 13.55, 14.20, 14.50, 15.15, 15.45, 16.10, 21.15, 21.40 Як гэта ўстроена? (12+)
12.05 Голыя і напалоханыя (16+).
17.35 Эд Стафард: той, хто выжыў (16+).
18.30, 18.55 Кафэ, закусачныя і забягалаўкі (12+).
19.25, 4.27 Хуткія і гучныя (16+).
23.05, 0.00, 0.55, 5.14, 6.01, 6.48 Залатая ліхаманка (16+).
1.50, 2.15, 2.45, 3.10, 3.40, 4.04 Бітвы скарбашукальнікаў (12+).

У праграме магчымы змяненні. Перадрукоўка праграмы забаронена. [СЦ] – фільм транслюецца са скрытымі субцітрамі.

Адбываецца відавочнае нагнятанне сітуацыі

Валянцін БАЙКО, член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах:

— Заставацца абыякавым да падзей на нашай граніцы, да тэмы міграцыйнага крызісу і яго вытокаў немагчыма, — кажа сенатар і звяртае ўвагу на тое, што адбываецца відавочнае нагнятанне сітуацыі, адказнасць за якую заходнія краіны хочуць перакласці на Беларусь.

— Гэта прамое ўмяшанне ва ўнутраныя справы суверэннай і незалежнай дзяржавы, — перакананы суразмоўнік і заклікае палітыкаў Еўрапейскага саюза несці адказнасць за ўзятыя раней абавязацельствы і неадкладна спыніць выкарыстанне ў сваіх палітычных мэтах ні ў чым не вінаватых людзей.

Дзе хвалёная еўрапейская талерантнасць?

Валерый ПАЛІШЧУК, член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве:

— Сітуацыя з бежанцамі на граніцы Беларусі і Польшчы — гэта ўсяго толькі яшчэ адзін элемент уздзеяння на нашу краіну. Бо ад уведзеных санкцый пакутуюць не палітыкі, а простыя народ. Санкцыі ніколі нікому не прынеслі нічога добрага і не могуць спрыяць вырашэнню праблем. Цяпер Еўрапейскі саюз ужо пагражае новымі пакетамі санкцый і будаўніцтвам пяціметровай сцяны, разважае аб поўным закрыцці граніц з Беларуссю. Зноў жа, у большай ступені ад гэтага пацерпяць звычайныя людзі, гандаль, малы бізнес, — лічыць сенатар.

Ён задаецца пытаннем: «Дзе хвалёная еўрапейская талерантнасць?» І дадае, што па даручэнні кіраўніка дзяржавы бежанцаў, якія апынуліся на тэрыторыі Беларусі, забяспечваюць самым неабходным.

— Мы робім усё, каб абараніць гэтых людзей. А што яны бачаць з боку Польшчы? — звяртае ўвагу Валерый Палішчук.

Ён перакананы, што сёння самае галоўнае — абараніць сваю краіну і свой народ, не дапусціць сутыкненняў.

— Бо як ніхто іншы беларускі народ не забыўся жахаў вайны, і гэтая памяць працягвае жыць у нашых дзецях і ўнуках, — рэзюмуе суразмоўнік.

Шырма для польскіх улад па ўтойванні іншых праблем

Уладзімір КАТОВІЧ, член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве:

— З боку беларускіх улад і нашага народа нямала зроблена для падтрымкі бежанцаў на тэрыторыі Беларусі, — кажа сенатар. — Бо мацней за любую бяду былі і застаюцца вера і ўзаемадапамога. Вера ў чалавечую разважлівасць, у перамогу міласэрнасці, у здаровы сэнс, які ў рэшце рэшт павінен узяць верх у гэтай вакханаліі, заложнікамі якой сталі жанчыны, старыя, дзеці.

Парламентарый нагадаў, што ў беларусаў на ўзроўні генетычнай памяці захаваны боль і страх ад страт, войнаў і кровапраліцця.

— І разам з тым дух нашага народа моцны, загартаваны як стрыжань нашай незалежнасці і веры ў перамогу справядлівасці. Вось таму нашы людзі ніколі нікога не кідаюць у бядзе, імкнуцца дапамагчы і падтрымаць, — падкрэслівае ён.

Уладзімір Катовіч звяртае ўвагу, што ў гэты час па ўсіх межах Еўрасаюза назіраецца рост колькасці бежанцаў, і гэта — наступствы дзеянняў ЗША на Блізкім Усходзе.

— Тое, што мы назіраем на граніцы з боку польскіх сілавікоў у дачыненні да бежанцаў, нельга назваць выкананнем нормаў міжнароднага права, — лічыць сенатар. — Калі б польская ўлада з самага пачатку крызісу дзейнічала ў адпаведнасці з агульнапрынятымі працэдурамі, то да сітуацыі, якая склалася, справа б не дайшла.

Уладзімір Катовіч перакананы, што цяперашні крызіс — усяго толькі шырма для польскіх улад па ўтойванні іншых праблем.

— Прыйшоў час Еўрасаюзу вырашаць праблему на граніцы з Беларуссю, вырашаць праз дыялог, — рэзюмуе ён.

Вырашаць трэба спакойна, канструктыўна і цывілізавана...

Уладзімір МАТВЕЕЎ, член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні:

— Абсалютна бесчалавечна і недапушчальна выкарыстоўваць вайсковую тэхніку і спецсродкі супраць мірных грамадзян, якія бягуць ад вайны, — перакананы сенатар. — Ужо шмат дзён захоўваецца трывожная абстаноўка на беларуска-польскай граніцы. Змучаныя холадам і бесчалавечным стаўленнем, людзі моляць польскія ўлады прапусціць іх у Еўрасаюз.

Ён нагадвае, што наша краіна аказвае разнастайную дапамогу і падтрымку бежанцам. Да беларуска-польскай граніцы накіроўваюцца партыі гуманітарнага грузу з прадуктамі харчавання і цёплымі рэчамі.

Як адзначае парламентарый, шматгадовая дэструктыўная палітыка калектыўнага Захаду ў дачыненні да краін Блізкага Усходу прывяла да складанай міграцыйнай сітуацыі на еўрапейскім кантыненце.

— Дзеянні польскіх улад нясуць відавочна правакацыйны характар, дэстабілізуюць абстаноўку ў цэнтры Еўропы, — падкрэслівае Уладзімір Матвееў і лічыць неабходным неадкладна садзіцца за стол перагавораў. — Прыцягнуць для гэтага ўрад, міжнародных экспертаў, праваабаронцаў, дыпламатычны корпус.

Парламентарый перакананы, што неабходна спакойна, канструктыўна і цывілізавана знайсці вырашэнне гэтага пытання. Не дапусціць абвастрэння на беларуска-польскай граніцы, захаваць здароўе і жыццё людзей.

У чым выяўляецца дэмакратыя, дзе барацьба за правы чалавека?

Марына ІЛЬІНА, член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні:

— Чарговы раз Рэспубліка Беларусь дэманструе свету гуманізм, спачуванне, прыхільнасць агульначалавечным каштоўнасцям, дапамагае людзям, якія апынуліся ў бядзе. Гэта ўсё ўласціва беларускай нацыі, — нагадвае сенатар і выказвае спадзяванне, што міграцыйны крызіс на беларуска-польскай граніцы можа і павінен быць вырашаны ў найбліжэйшы час.

— Недапушчальна падвяргаць даведзеных да адчаю людзей бесчалавечным выпрабаванням! — акцэнтуе яна ўвагу.

Парламентарый параўноўвае пазіцыі абедзвюх краін і робіць выснову аб супрацьлегласці:

— Беларусь: цёплыя рэчы, арганізацыя начлегу, падвоз гарачых абедаў, аказанне медыцынскай дапамогі. Польшча: калючы дрот, вадамёты, святлошумавыя гранаты. У чым выяўляецца дэмакратыя, дзе барацьба за правы чалавека? — задаецца пытаннем сенатар.

Выхадам будзе не агрэсіўна-папулісцкая рыторыка Захаду, а канструктыўны дыялог

Тамара ШАТЛІКАВА, член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве:

— Вырашэнне крызісу на граніцы Беларусі і Польшчы ляжыць не ў плоскасці прыняцця эмацыянальных рашэнняў, увядзення надзвычайнага або ваеннага становішча. Неабходна супрацоўніцтва ўсіх зацікаўленых бакоў, — выказвае свой пункт гледжання сенатар.

Яна нагадвае, што міграцыйная праблема існуе ў Еўропе не першы год і яе першапрычына замоўчваецца.

— Узнікае цалкам лагічнае пытанне: «Чаму грамадзяне краін Блізкага Усходу пакідаюць свае дамы і спрабуюць асталявацца ў Еўропе?»

Ці не таму, што моцныя гэтага свету ў свой час насуперак міжнароднаму заканадаўству ўмяшаліся ва ўнутраныя справы гэтых краін, сталі навязваць свае каштоўнасці народам іншай культуры, рэлігіі, менталітэту, разбурыўшы іх дамы і светапарадак, які складваўся дзесяцігоддзямі? Хто з іх пралічваў наступствы сваіх дзеянняў? — задае па сутнасці рытарычныя пытанні Тамара Шатлікава.

Яна падкрэслівае: дакладна не Беларусь вінаватая ў тым, што бежанцы з гэтых краін цяпер спрабуюць уладкавацца ў Еўропе.

— Таму цвёрда перакананая, што выхадам з сітуацыі, якая склалася, будзе не агрэсіўна-папулісцкая рыторыка Захаду, а канструктыўны дыялог усіх зацікаўленых, — рэзюмуе парламентарый.

Вы з кім ваяваць сабраліся — з бяззбройнымі старымі, жанчынамі і дзецьмі?

Андрэй ШЫШКІН, член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах:

— Ужо больш за тыдзень з трывогай і болем у сэрцы назіраю за падзеямі, якія адбываюцца на беларуска-польскай граніцы. Шчыра кажучы, тое, што вычвараюць палякі ў адносінах да бежанцаў, у тым ліку старых, жанчын і дзяцей, папросту не ўкладваецца ў галаве, — выказвае абурэнне сенатар.

Ён акцэнтуе ўвагу, што, патаптаўшы ўсе нормы маралі, этыкі і нават правы чалавека, безумоўным захаваннем якіх так часта пышыцца калектыўны Захад, палякі ў літаральным сэнсе знішчаюць ні ў чым не вінаватых людзей.

— Сёння бежанцаў выракаюць на жыццё ў нечалавечых умовах на нейтральнай паласе, абліваючы ў мінусавую тэмпературу з вадамётаў, атручваючы слёзатачывым газам, закідваючы святлошумавымі гранатамі, — нагадвае парламентарый. — Больш за тое, супраць 3000 чалавек, пазбаўленых прытулку і сродкаў да існавання, палякі сцягнулі да пагранічнага пераходу цэлы корпус колькасцю ў 15 000 сілавікоў і нават танкі! Спадары, вы з кім ваяваць сабраліся — з бяззбройнымі старымі, жанчынамі і дзецьмі?

Андрэй Шышкін не сумняваецца, што гэтыя жорсткія і бесчалавечныя па сваёй сутнасці дзеянні стануць яшчэ адной нязмыўнай ганебнай плямай у гісторыі Польскай дзяржавы.

— Пасля ўсіх гэтых злачынных дзеянняў не можна смела выкрасліваць са спіса цывілізаваных краін, — перакананы сенатар. — І, паверце, рана ці позна за фактычны генацыд кіраўнікам Польшчы давядзецца трымаць адказ і перад законам, і перад сваім сумленнем, калі, вядома, яно ў іх яшчэ засталося.

Усё, аб чым так гучна кажа Еўропа, — хлусня і крывадушнасць

Алена ЗЯБЛІКАВА, член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах:

— Вось твар дэмакратыі па-еўрапейску. Сітуацыя, якую можна было вырашыць мірным шляхам, напружаная да краёў, — кажа пра падзеі на беларуска-польскай граніцы сенатар.

Яна нагадвае, што людзі там знаходзяцца ў жудасных умовах:

— Халоднае надвор'е, а палякі іх аблiваюць вадой і труцяць слёзатачывым газам. Дзе ж тыя ўвага і клопат пра людзей, за якіх нібыта перажывае Захад, дзе іх прынцыповасць? — абураецца парламентарый.

Яна падкрэслівае, што адкрыта парушаюцца законы, правы чалавека, але еўрапейская супольнасць маўчыць, шукае вінаватых дзе заўгодна, толькі не ў сябе.

— Бежанцы, якія прыехалі ў Беларусь, рвуцца ў Еўропу ў пошуках сабе і сваім дзецям, на іх думку, лепшага жыцця. Але ім няма месца ў Еўрапейскім саюзе, іх не хочуць пускаць у так званы шчаслівы свет, — акцэнтуе ўвагу Алена Зяблікава.

Яна адзначае, што беларусы аказвалі і будуць аказваць бежанцам дапамогу, аднак гэта не вырашае праблему, абстаноўка нагнятаецца.

— Якія яшчэ доказы Еўропе патрэбныя, каб выканаць свае абавязацельствы і перастаць здзекавацца з бесабаронных людзей? — пытаецца сенатар і падкрэслівае: — Не варта пераварочваць сітуацыю і рабіць вінаватай Беларусь. Мы ўбачылі, што ўсё, аб чым так гучна кажа Еўропа, — хлусня і крывадушнасць. Выкарыстанне такіх бесчалавечных метадаў супраць мірных грамадзян — прамы доказ двайных стандартаў.

Еўрасаюз дэманструе двайныя стандарты ў сітуацыі з бежанцамі

Уладзімір ЛУК'ЯНАЎ, член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні:

— Нашы агульныя намаганні накіраваны на развязку міграцыйнага канфлікту. Мы робім усё магчымае, каб абараніць гэтых людзей, — падкрэслівае сенатар. — Пакуль Еўропа толькі абмяркоўвае магчымасць аказання гуманітарнай дапамогі бежанцам, у нашай краіне да беларуска-польскай граніцы рэгулярна накіроўваюцца прадукты харчавання, цёплае адзенне і іншыя рэчы, людзям аказваецца медыцынская дапамога.

Ён перакананы, што выкарыстанне польскім бокам вадамётаў і спецсродкаў у дачыненні да бяззбройных людзей недапушчальнае:

— Гэта расцэньваецца няйначай як гвалтоўныя дзеянні ў дачыненні да асоб, якія знаходзяцца на тэрыторыі іншай краіны, — лічыць парламентарый. — Польскія пагранічнікі дзейнічаюць у парушэнне норм гуманітарнага права. Еўрасаюз дэманструе падвойныя стандарты ў сітуацыі з міграцыйным крызісам.

Вольга АНУФРЫЕВА.

СІНЕРГЕТЫЧНЫ ЭФЕКТ ПА-СЕМУКАЦКУ

(Заканчэнне. Пачатак на 7-й стар.)

Каб рэалізаваць задуманае, была праведзена вялікая даследчая работа. Школьнікі па гэтай тэме пісалі адпаведны праект, апытвалі бацькоў і знаёмых, сярод ураджэнцаў знайшліся ахвотнікі правесці аналіз матэрыялаў па роднай спадчыне ў бібліятэках, добраахвотнікі апыталі і занатавалі нідзе яшчэ не згаданыя гістарычныя факты са слоў старажылаў, у тым ліку ўдзельнікаў або відавочцаў часоў Вялікай Айчыннай вайны, малалетніх вязняў.

— Калі сабралі ўвесь гэты матэрыял, вельмі парадаваліся: якая ж багатая і слаўная ў нас гісторыя! — дзеліцца Тамара Укружская.

Матэрыялаў і сапраўды сабралася на цэлую кнігу. У сельсавеце знайшлося шмат людзей, якія праславілі родны край працоўнымі подзвігамі. У Кнігу Славы Магілёўскага раёна ўвайшлі толькі адзначаныя ордэнамі. Крыўдна было, што подзвігі іншых на гэтым фоне засталіся незаўважанымі. Вырашылі выправіць гэты недахоп. Акрамя металічных кніг з гісторыямі вёсак, была створана яшчэ і папяровая, дзе ўся сабраная інфармацыя знайшла сваё адлюстраванне. Тэксты, дарэчы, напісаны выключна на роднай беларускай мове. Асобнай старонкай у ёй упісана партызанскае мінулае. На тэрыторыі сучаснага сельсавета ваявалі два партызанскія атрады — Канстанціна Белавусава і Асмана Касаева.

Тамара Укружская ўжо выношвае чарговую ідэю. Правесці сумесную канферэнцыю з прадстаўнікамі яшчэ двух раёнаў — Бялыніцкага і Клічаўскага, на тэрыторыі якіх дзейнічалі гэтыя атрады.

Ідэі ёсць? Грошы будуць!

Агульныя мясцовыя святы аб'ядноўваюць мацней, чым усе астатнія. Напэўна, таму жыхары больш ахвотна выдзяляюць на іх свае зберажэнні. На метал для «бібліятэкі» народ сабраў 560 рублёў. Яшчэ 500 ахвяравалі на глобус супрацоўнікі дзіцячага садка — школы. Глобус асаблівы тым, што на яго сусветнай прасторы адзначаны самы важны населены пункт на зямлі — Семукачы. Кнігі ў метале рабіў ураджэнец Семукачаў Мікалай Сталяроў. Зараз ён майстар вытворчага навучання Шклоўскага ліцэя № 12. На выраб металічных фаліянтаў яму спатрэбілася тры тыдні. Каштоўны груз даставіў да месца размяшчэння старшыня Сухароўскага сельскага Савета Аляксандр Зінкевіч, таксама ўраджэнец Семукачаў. Сваю лепту ўнесла Магілёўская абласная Асацыяцыя мясцовых Саветаў дэпутатаў, ахвяраваўшы на праект 3140 рублёў. Калектыўная праца яшчэ больш з'яднала ўдзельнікаў. На прэзентацыю прыехала шмат розных людзей. І адкрыццё было па-сапраўднаму шчырым і душэўным.

— Мы рабілі гэта дзеля памяці нашых продкаў, з пачуццём любові да нашай малой радзімы, — прызналася на адкрыцці Тамара Укружская. — І тое, што гэты комплекс з'явіўся ў самым ажыўленым месцы Семукачаў, невыпадкова. Можна не сумнявацца, што хутка кожны будзе ведаць гісторыі нашых малых вёсак. Дзеля гэтага не трэба ісці ў бібліятэку і шукаць адпаведную літаратуру. Дастаткова завітаць у нашу чытальню пад адкрытым небам.

Жывая лабараторыя...

Дарэчы, у Семукачах аператыўна адрэагавалі і на пажаданне Прэзідэнта заахвочваць моладзь займацца сельскагаспадарчай працай, як гэта было ў савецкія гады, калі пры школах існавалі фруктовыя сады і падсобныя гаспадаркі, а студэнты ездзілі на бульбу. У Семукачах пад лабараторыю, дзе зараз жывуць трусы, чарапахі, галубы, дэкаратыўныя куры, фазаны і іншыя жывёлы, прыстасаваны будынак былога дзіцячага садка. Тут жа знаходзіцца фіталабараторыя і зімовы сад. Цікавую ініцыятыву дзіцячы сад — школа рэалізавала сумесна з райвыканкамам.

— У нас у раёне ідзе актыўная работа па стварэнні такіх падсобных гаспадарак і замацаванні фруктовых садоў за школамі, — адзначыў **намеснік старшыні Магілёўскага райвыканкама Аляксандр АЛЕКСА.** — Гэта не толькі прывучэнне да працы, але і прафарыентацыя, прывычка працаваць у камандзе. У Семукачах мы адной справай вырашылі два пытанні. Па-першае, жывая лабараторыя дазволіць дзецям лепей вывучаць школьны матэрыял, дзесьці вызначыцца з прафесіяй, з карысцю правесці час замест таго, каб сядзець у камп'ютары. Па-другое, увялі ў абарот будынак, які доўгі час не выкарыстоўваўся. Гэты дзіцячы садок быў закрыты яшчэ ў 2003 годзе. У яго былі розныя ўласнікі, але другое жыццё яны яму так і не далі. Педкалектыў Семукацкага комплексу дзіцячы садок — школа выйшаў з прапановай на выканкам, і яна была падтрымана. Будынак давялі да ладу метадам народнай будоўлі. Зараз там знаходзяцца і жывёлы, і расліны. Дзеці будуць вывучаць, як вырошчваецца зерне, як рыхтуецца глеба, як працаваць з жывёламі. Акрамя гэтага, яны будуць займацца яшчэ і даследчай работай. З лабараторыяй вывучэнне жывёльнага і раслінага свету пойдзе значна хутчэй.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

ДОБРАЯ СПРАВА

БОНУСЫ ЗА АКТЫЎНАСЦЬ

Як Магілёўская абласная асацыяцыя мясцовых Саветаў дэпутатаў натхняе жыхароў на навядзенне прыгажосці

У апошнюю пятніцу кастрычніка адбылося ўрачыстае ўзнагароджанне пераможцаў конкурсу ініцыятыў з уручэннем падарачных сертыфікатаў. Сёлета на сходзе Магілёўскай абласной асацыяцыі мясцовых Саветаў дэпутатаў было прынята рашэнне падтрымаць ужо рэалізаваныя грамадскія ініцыятывы, каб заахвоціць насельніцтва. Па словах дырэктара асацыяцыі Паліны ЦЕРАШКОВАЙ, на конкурс паступіла 12 заявак. Тром пераможцам — з Глуска, Краснаполля і Круглага — асацыяцыя ўручыла сертыфікаты на тры тысячы, дзве і паўтары тысячы рублёў адпаведна. Прэміяльныя бонусы дазваляецца накіраваць у тым ліку і на рэалізаваныя праекты, каб чымсьці іх дапоўніць.

Рамонт дарогі, добраўпарадкаванне дзіцячых пляцовак, месцаў масавага адпачынку, аб'ектаў культуры, стварэнне і развіццё спартыўных аб'ектаў — нагод для вырашэння пытанняў мясцовага значэння з удзелам насельніцтва колькі заўгодна.

— Наша задача — накіраваць грамадскую думку ў патрэбнае рэчышча, — удакладняе **старшыня Магілёўскага абласнога Савета дэпутатаў Ірына РАІНЧЫК.** — Галоўнае — правільна вызначыцца з надзённай праблемай для канкрэтнай акругі або раёна. Калі пытанне актуальнае, насельніцтва падтрымае яго і фінансава, і фізічна.

Праект па ўстаноўцы вулічных трэнажораў у гарадскім пасёлку Глуск рэалізаваны па ініцыятыве аддзела па адукацыі, спорце і турызму Глускага райвыканкама. Аб неабходнасці мець на тэрыторыі райцэнтра спартыўную пляцоўку з абсталяваннем для дзяцей і дарослых гаварылася неаднойчы. Зараз насельніцтва мае магчымасць падтрымліваць здаровы лад жыцця з дапамогай вулічных трэнажораў. У рэалізацыі праекта прынялі ўдзел пяць дэпутатаў, больш за 20 мясцовых жыхароў і шэсць арганізацый раёна. Абласная асацыяцыя мясцовых Саветаў дэпутатаў выдзеліла на рэалізацыю гэтага праекта 4450 рублёў. Сума суфінансавання ад насельніцтва склала каля 550 рублёў. Для захаванасці абсталявання ад вандалаў і нядобрасумленных грамадзян месца для пляцоўкі падбіралася так, каб быць у зоне сістэмы відэаназірання. Парадак тут падтрымліваюць найбольш актыўныя карыстальнікі з дзіцячай юнацкай спартыўнай школы.

— Праекты для фінансавання мы выбіраем на конкурснай аснове, — удакладняе **старшыня асацыяцыі Анатоль МАЦЮЛІН.** — Галоўнае патрабаванне — яны павінны быць ініцыіраваны жыхарамі, гатовымі прымаць удзел у іх рэалізацыі. Бо першасная задача — не проста падтрымаць добрую ініцыятыву, а ўцягнуць людзей у працэс яе ўвасаблення.

Тры апошнія гады асацыяцыя актыўна ўдзельнічае ў рэалізацыі мясцовых ініцыятыў. За гэты час розныя даплаты на агульную суму 200 тысяч рублёў атрымала 88 мясцовых ініцыятыў.

Дэпутат Краснапольскага райсавета дэпутатаў ад Ціміразеўскай выбарчай акругі № 2 Наталля ГЕРАШЧАНКА ініцыіравала праект «Спортлэнд — спорт як гульня!». Нагодай стаў зварот жыхароў падчас сустрэчы на дыялогавай пляцоўцы з кіраўніцтвам раёна. Усе знакавыя спартыўныя аб'екты райцэнтра знаходзяцца аддалена ад мікрараёна, а вось у раёне вуліцы Ціміразева, дом № 38, не было добрай дзіцячай пляцоўкі. Разам з жыхарамі шчыравалі дэпутаты. Фінансавая дапамога асацыяцыі склала 1450 рублёў, плюс прыкладна траціну ад гэтай сумы сабрала насельніцтва. Пляцоўка знаходзіцца пад наглядам Краснапольскага жылкамунгаса.

Прапанова аб адраджэнні месца для адпачынку са спускам да ракі Друць у круглянскім гарадскім скверы была агучана на справаздачнай сесіі Круглянскага райсавета дэпутатаў членам Маладзёжнага парламента, вучаніцай 9 класа сярэдняй школы № 1 Валянцінай Коваль. Гэтая ідэя адно з самых наведвальных у райцэнтры, на жаль, яму не хапала парадку. Круглянскі райсавет дэпутатаў прапанаваў рэалізаваць праект шляхам максімальнага прыцягнення грамадскасці і арганізацый раёна. У рамках праекта ўстанавілі пастамент пад камень, паклалі тратуарную плітку па перыметры, высадзілі дэкаратыўныя дрэвы і кусты, адрамантавалі танцпляцоўку, зрабілі і ўстанавілі малыя архітэктурныя формы і дзесяць лавак, падстаўкі пад памятныя шыльды, каркас для банераў. А каб нашчадкі не забывалiся, што месца трэба берагчы, зрабілі закладку капсулы часу для будучых пакаленняў. У справе прымалі ўдзел болей чым сто чалавек — жыхароў і прадстаўнікоў 12 мясцовых арганізацый.

— Аб'ект абышоўся нам у 22 184 рублі, — удакладніў **старшыня раённага Савета дэпутатаў Сяргей ХРАМЦОЎ.** — Магілёўская абласная асацыяцыя перадала на яго 1450 рублёў.

Бонусы ад асацыяцыі

1-е месца (тры тысячы рублёў) — ініцыятыва «Устаноўка вулічных трэнажораў у гарадскім пасёлку Глуск».

2-е месца (дзве тысячы рублёў) — ініцыятыва «Спортлэнд — спорт як гульня!» у Краснаполлі.

3-е месца (паўтары тысячы рублёў) — ініцыятыва «Добраўпарадкаванне гарадскога сквера «Спуск да ракі» і касметычны рамонт танцавальнай пляцоўкі» ў Круглым.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

Фота з архіва Магілёўскай абласной асацыяцыі мясцовых Саветаў дэпутатаў.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Заснавальнікі: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ АЛЯКСАНДР МІКАЛАЕВІЧ.

Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

АДРАС РЭДАКЦЫІ: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 311 17 35;

e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.

Тыраж 14.804. **Нумар падпісаны ў 19.30 18 лістапада 2021 года.**

ЯК КАСЦЮКОВІЧЫ КАМУНАРАМІ СТАЛІ

Касцюковічы з відам на новы Свята-Крыжаўзвіжанскі храм.

Райцэнтру пашчасціла з чыгункай, туды нават цягнік з Гродна ходзіць. Але не пытайцеся ў касе вакзала, як даехаць да Касцюковіч. Вам усё роўна прададуць білет да Камунараў. Бо яны і ёсць Касцюковічы. Праўда, цікава? Яшчэ і ў горад не прыехалі, а ўжо інтрыгі. А што далей будзе?

ЗЯМЛЯ ПАЭТАЎ, ПІСЬМЕННІКАЎ, МАСТАКОЎ

Насамрэч доўга тлумачыць, дзе тыя Камунары-Касцюковічы знаходзяцца, трэба не ўсім. Напрыклад, беларускія паэты і пісьменнікі і так ведаюць. Раз на два гады тут праводзіцца пісьменніцкі фестываль «Пісьмянкоў луг». Прысвечаны ён светламу і лірычнаму паэту Алесю Пісьмянкову, які родам з тутэйшай вёскі з прыгожай назвай Бялынкавічы. З гары, дзе ўстаноўлены памятны знак у гонар паэта, адкрываецца прыгожы краявід з ракой Бесяддзю. Глядзіш на гэтую прыгажосць і разумееш, што не стаць пісьменнікам або паэтам у такой прыгажосці проста немагчыма.

Фестываль, які носіць прозвішча Алеся Пісьмянкова, вельмі душэўны. Удзельнікі спачатку наведваюць малую радзіму паэта, ляльку Паспяхоўку. Можна насіць у сумачцы і так поспех прываблівать. А можна купіць за сем рублёў сімпатычную феечку на каркасе з сінтэпону і фоамірану. Пад заказ тут гатовы і ікону вышыць, і карціну напісаць. Падчас майго візіту ў шырокім асартыменце былі драўляныя лялькі розных памераў і відаў.

— Лялькі з дрэва і разьба — гэта наогул нашы брэндавыя вырабы, — паведамілі майстрыхі. — Так, як мы, іх ніхто не робіць.

Таксама расказалі, што попытам карыстаюцца драўляныя звяры, птушкі, розныя іншыя істоты. Яны сапраўды вельмі прыгожыя. Каштуюць у сярэднім 25 рублёў. А вось драўляную лыжку можна купіць за 5. Цана шкатулкі-арганайзера ад 25 рублёў да 100.

